Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў):

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Змена адрасу: Інакагародніх месцовых — 20 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок калярэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок калярэлі паперок тэксту 1 р. — к.
За радок калярэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожей.
Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумент . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрадоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў ваколтах газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА: канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 282 (2470) Субота, 8-га сьнежня 1928 г.

Урокі рурскае барацьбы.

Прафсаюзы пад кіраўніцтвам рэфармістаў—органы буржуазеі

БЭРЛІН. 6-XII. У зьвязку з аднаўленьнем працы ў Рэйнска-Вэстфальскай вобласьці, ЦК нямецкае кампартыі зьвярнуўся да нямецкае рабочае прэсы з адозваю, у якой зазначае, што рабочыя не падначаляцца на доўгі час пастанове Зэвэрынга. Сьпікі барацьбы ў наступным: кааліцыя азначае выдачу рабочых клясаваму ворагу, які падрыхтоўвае вайну: бюракратыя рэфармісцкіх прафсаюзаў можа толькі здраджваць рабочым; прафсаюзы будуць дапаможнымі органамі буржуазеі, калі яны застануцца пад кіраўніцтвам рэфармістаў.

ТЫСЯЧЫ РАБОЧЫХ РУРУ ПАПАЎНЯЮЦЬ КАМПАРТЫЮ.

БЭРЛІН. За лістапад у аднэй толькі Рурскай акрузе, якая зьяўлядцца толькі часткаю лёкаутаванага райёну, 689 рабочых увайшло ў кампартыю і 225—у камсамол. Колькасьць увайшоўшых у кампартыю на справе ў два-тры разы большая, бо большасьць запу аб уваходзе ў партыю яшчэ не разгледжана.

Першыя дні сьнежня адзначаны магутным прытокам новых сяброў, як з ліку сяброў сацыял-дэмакратычнае партыі, так і з ліку рабочых, якія да гэтага часу ня былі ні ў якой палітычнай партыі.

На працу ўзяты ня ўсе лёкаутаваныя.

БЭРЛІН. Цэнтральны стачачны камітэт Рэйнска-Вэстфальскае вобласьці зьвярнуўся да нямецкае рабочае прэсы з адозваю, у якой выказвае ўдзячнасьць за падтрыманьне металёўцаў і кампанію салідарнасьці з імі. Далей цэнтральны камітэт выказвае ўдзячнасьць Міжрабпому.

Камітэт паведамляе, што частка лёкаутаваных рабочых ня ўзята на працу і ім патрэбна дапамога.

ПАД СЬЦЯГАМ АГУЛЬНАГА ФРОНТУ З РАБОЧАЮ КЛЯСАЮ

СЭСІЯ ЎСЕНЯМЕЦКАГА СЯЛЯНСКАГА САЮЗУ.

БЭРЛІН, 6-XI. У Бэрліне скончылася сэсія агульнанямецкага сялянскага саюзу—арганізацыі прапоўнага нямецкага сялянства; гэты саюз зьявіцца з камуністычнай партыяй.

Сэсія заслухала даклад камуністычнага дэпутата рэйхстагу Герулле аб эканамічным палітычным становішчы сялянства ў Нямеччыне. Са справаздачаю аб дзейнасьці праўленьня саюзу выступіў сябра праўленьня, камуністычны дэпутат Тутце.

У спрэчках па дакладах выявілася аднадушнае імкненьне сяброў саюзу абярэшць саюз у банную арганізацыю прапоўных сялян у саюзе з рабочаю клясаю дзеля барацьбы за палітычныя і эканамічныя інтарэсы прапоўнага сялянства. У якасьці адзнае з галоўных задач саюзу сэсія высунула барацьбу проці надзвычайнага апалатканьня сялянства і проці несправядлівасьці капіталістычнае падатковае сыстэмы.

Сэсія абрала новы склад праўленьня.

Паўстаньне аўганскіх рэакцыянэраў.

ТЭРМЕЗ. (На аўганскай мяжы). Водлуг вестак з Аўганістану, у канцы лістапада ў раёне гораду Дакі калі Аўгана-індыйскае мяжы паўстала племя шынвары. Паўстаўшыя спалілі дчыненыя падышахам школы і высунулі патрабаваньне скасаваць прапаваныя падышахам і ўхваленыя народным зборам рэформы. Па дакумантах, захопленых у паўстаўцаў, установлена, што кіраўнікі паўстаньня падтрымліваюць сувязь з племенямі, якія знаходзяцца на той бок мяжы ў фэры ангельскага ўплыву.

ПАЎСТАНЬНЕ СПРАВАКАВАНА АНГЛІЯЙ.

ТЭРМЕЗ. (На аўганскай мяжы). З Аўганістану паведамляюць, што паўстаньне племяньня шынвары пашыраецца. Водлуг заяў чужаземцаў, якія ўцяклі з Джэлабаду, паўстанцы маюць ангельскую зброю.

Аўганскі ўрад ужыў рашучыя захады, каб прадушыць рэакцыйнае паўстаньне.

ЗАМАСКАВАНЫ СТАН АБЛОГІ Ў ХАРВАТЫІ.

ВЕНА, 6-XII. Як паведамляюць з Белграду, у зьвязку з загрэбскімі падзеямі 1-га сьнежня зволен прэфект загрэбскае акругі Зрэлец. Прэфектам назначан артылерыйскі палкоўнік Максімовіч, які лічыцца даверанаю асобаю рыдворнае граі «Белая Рука».

Палітычныя колы ацэньваюць назначэньне прэфектам вайскоўца замаскаваным увядзеньнем асаднага становішча. Цэлер сялянска-дэмакратычнае апазіцыі Трыбічэвіч заявіў, што кааліцыя апрацэстуе назначэньне Максімовіча ў адміністрацыйным судзе.

ЗАЎВАГА: 1-га сьнежня ў дзень урачыстага сьвяткаваньня дзесятых угодак існаваньня сучаснае Югаславіі ў Загрэбе адбываліся дэманстрацыі хорвацкіх аўтанамістаў. Між дэманстрантамі і паліцыяй здарыліся крывавыя стычкі.

ФАШЫСТЫ НАЦКОЎВАЮЦЬ УРАД НА РАЗГРОМ АПАЗІЦЫІ.

ВЕНА. 6-XII. Белградзкі вультраправы фашысцкі друк востра крытыкуе габінэт Карошэца, абвінавачваючы яго ў нерашучасьці ў адносінах да харвацкае апазіцыі. Фашысцкі друк патрабуе адстаўкі Карошэца, каб апошні „вызваліў месца для ўраду моцнае рукі".

РУМЫНСКАЯ ЛЕЯ КОЦІЦЦА УНІЗ.

ЗАКАРЫСТАНЬНЕ ЛІБЭРАЛАМІ ЦЯЖКАСЬЦЯЎ УРАДУ МАНІУ.

ВЕНА, 6-XII. У зьвязку з перарывам перамоў румынскага ўраду з чужаземнымі фінансавымі групамі наконт пазыкі, курс леі на заграніччных біржах зьніжаўся а апошнія дні на 5-10 проц. Вестні пра замер упаду отабілізаваць лею выкінулі з боку міжнароднае спэкуляцыі сустрэчны планаўр, які вызваўся ў зьніжэньні курсу леі.

Румынскі афіцыёзны друк імкнецца запэўніць эканамічныя колы, заяўляючы, што ўрад Маніу не дапусьціць далейшага зьніжэньня курсу. Прэзыдэнт румынскага нацыянальнага банку падкрэсьліў у гутарцы з журналістамі, што недавер'е заграніцы да леі беспадстаўна. Урад, згодна яго заявы, мае належны запас валюты, каб забясьпечыць цьвёрды кошт леі.

Нацыянальны банк даў даручэньне называць леі заграніцаю ўсюды, дзе яны толькі ёсьць. Адкан, гэтае даручэньне ў Лёндане, Парыжы, Жэневе і Будапэшце ня выканана з прычыны скупкі леі спэкулянтамі.

Урадавы орган „Дрэптатэа" (выходзіць у Кішынёве) абвінавачвае банкі, якія знаходзяцца ў руках лібэралаў, у сабатажы і ў супрацоўніцтве з міжнароднымі спэкулянтамі з мэтаю абцяжарыць становішча ўраду і кантраляваць яго пазыцыі.

ПАГРОЗЫ ЎРАДУ АДНАВІЦЬ ЦЭНЗУРУ.

ВЕНА. 6-12. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскі міністр унутраных спраў Вайда-Вайвод заявіў прадстаўнікам друку, што ўрад нездаволен паводзінамі друку пасьля скасаваньня цэнзуры. Міністр заклікае журналістаў „не злоўжываць скасаваньнем цэнзуры", інакш урад ужыве захады дзеля абароны ўрадавых інтарэсаў.

Увесь румынскі друк, у тым ліку і прыхільны ўраду, выказвае абдзіўленьне і нездаволеньне гэтаю заявою.

КАЛЮМБІЯ АХОПЛЕНА ЗАБАСТОЎКАМІ.

Амэрыканцы-канцэсіянэры дамагаюцца інтэрвэнцыі П.-А. Зл. Штатамі.

НЬЮ-ЁРК, 6-12. Водлуг (атрыманых тут вестак, у Калюмбіі (Паўднёвая Амэрыка) выбухнулі буйныя забастоўкі рабочых бананавых плянтацый. Бастуе больш 12-ці тысяч рабочых на бананавых плянтацыях, якія належаць амэрыканцам у райёне Магдагены.

Забастоўка абвешчана ў знак пратэсту проці адмовы прадпрыемцаў прыстасаваць да рабочых закон аб страхаваньні. Частка чыгуначных рабочых абвясьціла забастоўку салідарнасьці.

Канцэсіянэры са Злучаных Штатаў дамагаюцца інтэрвэнцыі Злучаных Штатаў.

АНГЕЛЬСКАЯ АХВЯРА НА КАРЫСЬЦЬ АНГЛА-ЯПОНСКАГА САЮЗУ.

ЛЁНДАН, 6-XII. «Дэйлі тэлеграф» (газэта, блізкая да міністэрства замежных спраў) піша: „Ёсьць падставы думаць, што частка марскіх прац у зьвязку з пабудоваю Сінгапурскае ваенна-марское базы ня будзе выканана».

Не зважаючы на афіцыйнае адхіленьне, чуткі пра частковую адмову ад пабудовы Сінгапурскае ваенна-марское базы зрабылі ў палітычных колах вялікае ўражаньне. Іх зьвязваюць з нядаўнімі заявамі японскіх газэт, што абавязковаю ўмоваю англа-японскага зьбліжэньня зьяўляецца пераглядзе ваенна-марское палітыкі Англіі ў Сінгапуры, які закранае інтарэсы Японіі.

Антыімпэрыялістычны рух праз галовы чанкайшыстаў

НАНКІНСКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРОЦІ ЯПОНІІ.

ШАНХАЙ, 6-XII. Нацыянальная антыяпонская асацыяцыя праводзіць антыяпонскі тыдзень, які ў Нанкіне распачаўся вялічэзнай дэманстрацыяй пад лёзунгамі з патрабаваньнем ад нацыянальнага ўраду цьвёрдасьці ў надыходзячых перамовах з Японіяй.

4-ая СЭСІЯ ЦВК СССР.

Сэсія ўхваліла агульнасаюзны бюджэт у разьмеры 7 МІЛІЯРДАЎ 700 МІЛІЁНАЎ руб.

Дэлегацыі ўсіх саюзных рэспублік затрабавалі ад ураду паставіць даклад аб міжнародным становішчы СССР.

Заявы дэлегацый саюзных рэспублік.

МАСКВА. Увечары 6-га сьнежня адбылося супольнае пасяджэньне Саюзнага Савету і Савету Нацыянальнасьцяй.

Адчыняючы пасяджэньне, Чарыкоў дае слова Энукідзэ, які паведаміў пра заявы, пададзеныя ў прэзыдыум ад дэлегацый саюзных рэспублік. Дэлегацыя РСФСР у сваёй заяве зазначае, што ў апошні час у друку зьявіліся паведамленьні пра групоўкі варожых СССР міжнародных сіл. Такімі зьяўляюцца паведамленьні пра ўгавор між Польшчай і Румыніяй, пра англа-французкі блёк і пра заснаваньне міжнароднага саюзу крэдытароў царскае Расеі. Дэлегацыя просіць паставіць на сэсіі даклад НК па Замежных Справах аб міжнародным становішчы Саюзу. Такія-ж заявы пададзены дэлегацыямі Туркменскае, Узьбецкае, Беларускае, Украінскае і Закаўкаскае рэспублік. Прэзыдыум ЦВК СССР лічыць магчымым паставіць такі даклад на пленарным пасяджэньні сэсіі ў панядзелак вечарам. Прапанова паставіць даклад аб міжнародным становішчы ўхваляецца аднагодна.

Дэлегацыя батракоў вітае сэсію.

Пасьля гэтага сэсію прывітала дэлегацыя ўсесаюзнага зьезду сельска-гаспазарчых і лясных рабочых. Батрачка Лехадухава пры перадачы прывітаньня ад зьезду зазначае, што зьезд сельска-гаспадарчых і лясных рабочых даручыў дэлегацыі прасіць урад, каб законы, якія вылаюцца ў інтарэсах батракоў, поўнасьцю ажыцьцяўляліся.

Ад імя зьезду дэлегацыя абяцае сэсіі ўзяць самы актыўны ўдзел у надыходзячых перавыборах сельсаветаў і дапамагчы савецкай уладзе ажыцьцёвіць сацыялістычнае будаўніцтва.

З заключным словам па дакладах аб бюджэце выступілі т. т. Вайнштэйн і Бруханаў.

Абмен думкамі аб бюджэце.

МАСКВА, 7-XII. 6-га сьнежня на раніцішнім пасяджэньні Саюзнага Савету адбываліся спрэчкі аб бюджэце.

Балашова (РСФСР) гаворыць аб культурных патрэбах і затрабаваньнях вёскі.

Будавець, як мага больш, школ—пакінна стаць нашаю пастаяннаю турботаю,—гаворыць Бойчэнка (Чарнаморская акруга).

Аб неабходнасьці праверыць эфэктыўнасьць укладаў у прамысловасьць і сельскую гаспадарку гаворыць Лісовік (УССР).

Кукалеўскі (РСФСР) просіць сэсію сваім аўтарытэтам прымусіць зьвярнуць увагу на барацьбу з алкагалізмам.

Лівянец на украінскай мове прысьвячае сваё выступленьне пытаньням уладу сельскае гаспадаркі на Украіне ў вязку з неўродам.

Кузьмін (Чырвоная армія) зазначае, што Чырвоная армія зьвяцца ня толькі абаронцаю прапоўных. Яна адначасна служыць для працоўных добраю школаю. Кузьмін просіць аб асыгнаваньні дадатковых сродкаў НК па вайсковых і марскіх справах на ўзмацненьне культпрацы ў арміі.

Салаўёва (ЗСКСР) лічыць неабходным ужыць захады да ўзмацненьня прыбытковасьці сельскае гаспадаркі.

Дзяньшыкоў (Сібір) ганьбіць скабую працу каапэрацыі. Каапэрацыя мае вялікія чаргі, якіх можна ўхілінца пры добрай пастаноўцы справы.

Азэрбайджанскі рабочы-вагар Разно ўзьнімае пытаньне аб неабходнасьці ўзмацніць барацьбу з хуліганствам.

Любушкін (Аранбурская акруга) зазначае на неабходнасьць павялічыць сетку культурных устаноў на вёсцы.

Выступленьне Яцкевіча (БССР), які лічыць патрэбным узмацніць увагу да мясцовага бюджэту, спрэчкі на бюджэце ў Саюзным Савеце спынілася.

Заключнае слова т. Бруханава.

МОЦНАСЬЦЬ НАШАЕ ВАЛЮТЫ БУДЗЕ ЗАЛЕЖАЦЬ АД ВЫКАНАНЬНЯ НАМЕЧАНЫХ БЮДЖЭТАМ ПЛЯНАЎ. АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТЫХ ПЛЯНАЎ БУДЗЕ НАШЫМ ГАСПАДАРЧЫМ ЭКЗАМЕНАМ.

МАСКВА, 6-XII. На пленуме сэсіі ЦВК СССР у вячэрнім пасяджэньні 6-га сьнежня ў заключным слове па дакладу аб выкананьні бюджэту за 1926 27 г. Вайнштэйн зазначыў, што спрэчкі аб яго дакладзе пацьвердзілі правільнасьць зробленых ім асноўных вывадаў аб выкананьні бюджэту.

Потым в заключным словам выступіў Бруханаў. Варочаючыся да пытаньня аб сельска-гаспадарчым падатку, Бруханаў паведамляе, што воддуг жаданьня сялян-удзельнікаў працы сэсіі ЦВК гэтаму пытаньню будзе прысьвечана спэцыяльная нарада. Бруханаў не адхіляе недахопаў, якія наглядаюцца ў працы па ажыцьцяўленьні на мясцох закону аб сельска-гаспадарчым падатку. Тлумачацца яны нездавальняючым інструктаваньнем савецкіх працаўнікоў на мясцох.

Некаторыя таварышы—казаў далей Бруханаў,—закранулі, нібыта, наглядаемае ў нашым бюджэце няправільнае размеркаваньне сродкаў між Саюзам і саюзнымі рэспублікамі. Яны забывалі, што выдаткі на задаволеньне шматлікіх патрэб асобных рэспублік праходзяць па агульнасаюзнай частцы бюджэту і, наадварот, некаторыя агульна-саюзныя патрэбы праводзяцца праз рэспубліканскія бюджэты. Правільна зазначалі некаторыя таварышы на недахват сродкаў для выкананьня шматлікіх мясцовых патрэб. Усё гэта-цалком спраўдлівыя скаргі і заўвагі. Але-ж толькі недахватам у нас рэсурсаў і тлумачыцца немагчымасьць задаволіць гэтыя законныя патрабаваньні. Тав. Веташкін у сваім выступленьні—кажа далей Бруханаў,—зрабіў заўвагу, што нашымі звышпланавымі выдаткамі мы ствараем пагрозу абясцэньваньня нашага рубля. Гэта зусім няправільная заўвага. Усе нашыя т. зв. звышпланавыя выдаткі робяцца за кошт дадатковых эмісій. Абясцэньваньне нашага рубля можа быць толькі ў выніку недавыкананьня нашых гаспадарчых планаў. Летась мы ня выканалі нашых плянаў. Мы меркавалі, што ў працягу году адбудзецца зьніжэньне прамысловых цэн і павысяцца пакупныя магчымасьці жыхарства. Зьніжэньне на прамтавары было праведзена, але пакупныя магчымасьці жыхарства на павысіліся. Гэта здарылася з прычыны павышэньня цэн на прадукты сельскае гаспадаркі. Таму ўвосені мы маем зьніжэньне пакупных магчымасьцяў прыблізна на 3 проц.

Утойваць гэтага нам ня прыходзіцца. Аб гэтым ведае па сваім бюджэце кожны рабочы і селянін. Гэта ненажаданае зьявішча, але яно ня было выклікана бюджэтам, бо выкананьне бюджэту не патрабавала новае эмісіі. Сёлета не прадугледжваецца значнага зьніжэньня адпускных цэн у прамысловасьці. Адносіны цэн на прамысловыя тавары і прадукты сельскае гаспадаркі павінны заставацца на сучасным узроўні. Гэтым самым прамысловасьці даюцца дадатковыя сродкі для выкананьня тых вялічэзных плянаў прамысловага будаўніцтва, якія мы ўхвалілі. Гэта дасьць нам у будучым магчымасьць узыйсьці на шлях далейшага зьніжэньня цэн. Самым найлепшым спосабам не падстаўляць нашую валюту пад рызыку зьяўляецца ажыцьцяўленьне намечаных намі плянаў на гэты год: зьніжэньне сабекошту прамысловае прадукцыі на 7 проц., пашырэньне на 7 проц. засеўнага абшару і павышэньня на 3 проц. ураджайнасьці. Калі мы ажыцьцёвім гэтыя пляны, дык мы вытрымаем гаспадарчы экзамен і будзем мець гарантыю, што пакупныя магчымасьці нашага рубля ня зьнізяцца.

БЮДЖЭТ УХВАЛЕН.

Воддуг прапановы Кульбяшэрава, *сэсія ўхваляе пастанову аб тым, што бюджэт у асноўным зацьвярджаецца ў рэдакцыі бюджэтнае камісіі. Праэкт бюджэту перадаецца ў бюджэтную камісію для разгляду паправак і заўваг, выказаных у часе спрэчак.*

Ухваляецца таксама пастанова зацьвердзіць у асноўным пададзены бюджэтнай камісіяй праэкт рэзалюцыі па дакладу аб выкананьні бюджэту за 1926-27 г.

ФРАНЦУСКІЯ ІМПЭРЫЯЛІСТЫ РЫХТУЮЦЦА..

У той час, калі французкі генэральны штаб дзейна падрыхтоўваецца да вайны з Савецкім Саюзам, у той час, калі нястомны агэнт французкага імпэрыялізму генэрал Лерон, які падарожнічае па сталіцах Польшчы, Румыніі, Баўгарыі, Вэнгрыі і іншых краін і ўгаварвае ўрад гэтых дзяржаў уступіць у антысавецкі блёк,—Пуанкарэ і шэраг іншых палітычных дзеячоў сучаснае Францыі ня менш энэргічна распачалі падрыхтоўваць грамадзкую думку Французкае рэспублікі да прыняцьця падрыхтоўваемай і правакуемай імі вайны з першаю ў сьвеце рэспублікаю працоўных.

У гэтай адносіне вельмі характэрна рэпліка Пуанкарэ, зробленая ім у палаце дэпутатаў пры абмеркаваньні апошняга бюджэту вайсковага міністэрства.

— Я ўрачыста абавязваюся, — заявіў Пуанкарэ выступаючаму ў спрэчках дэпутату Дэзоблену,—у той дзень, калі будзе даведзена, што вашы савецкія прыяцелі згодны на ўсеагульнае разбраеньне, зрабіць тое самае!

Вельмі гучна сказана! Толькі прыходзіцца дзівіцца кароткай, калі гэта ім патрэбна, памяці панаў буржуазных міністраў і ў прыватнасьці гэткай па меншай меры дзіўнай забыўчасьці сучаснага дыктатара Францыі—Пуанкарэ.

Наколькі мы помнім, гэта іменна Савецкі Саюз унёс у свой час у падрыхтоўчую камісію па разброеньню Лігі Нацый сваю прапанову аб усеагульным і поўным разбраеньні, якая сустрэла шалёны адпор з боку прадстаўніка Францыі ў Лізе Нацый «сацыяліста» Поля Бонкура.

І калі гэты адзіна практычны, адзіна сумленны праэкт поўнага разбраеньня быў адхілен прадстаўнікамі буржуазных дзяржаў, мы ўнесьлі другую практычную прапанову аб частковым разбраеньні. Гэты другі наш праэкт, зноў такі, галоўным чынам, дзякуючы нежаданьню прадстаўніка імпэрыялістычнай Францыі «сацыяліста» Поля Бонкура, да гэтага часу нават не разгледаўся Лігай Нацый.

Вось якія факты. Каго-ж хоча ашукаць пан Пуанкарэ сваёю заявою, што ён гатоў узяць з нас прыклад, калі мы згодзімся на ўсеагульнае разбраеньне? Мы з свайго боку ня толькі на яго згадзіліся, але нават самі ўнесьлі ў буржуазную Лігу Нацый дэтальны праэкт гэтага ўсеагульнага разбраеньня. Пану Пуанкарэ заставалася толькі далучыцца да гэтага праэкту, чаго ён, зразумела, не зрабіў. Не зрабіў таму, што пляны французскіх і іншых імпэрыялістаў зусім іншыя, што яны думаюць цяпер менш усяго аб сапраўдным разбраеньні. Іх галоўная мэта зараз не разбройваць, а наадварот, сьпешна рыхтавацца да вайны супроць СССР, сьпешна рыхтавацца да рашучай сутычкі з сусьветным рэвалюцыйным рухам. Іх мэта—спрабаваць зьвесьці з зямлі першую ў сьвеце рэспубліку працоўных, якая сьмела будзе сацыялізм у сваёй краіне, якая сваім прыкладам навочна паказвае працоўным усіх краін, як трэба рабіць пралетарскую рэвалюцыю, як трэба змагацца з буржуазеяй.

Але можа пан Пуанкарэ «рантам» зьмяніў свой пункт погляду на гэтае пытаньне? Можа ён «рантам» спрачаўды ў пацыфічным настроі? Што ж, мы будзем толькі вельмі шчыра вітаць гэткае пераўтварэньне Пуанкарэ—вайны ў Пуанкарэ—пацыфіста.

Але чаму-ж тады пан Пуанкарэ ня зьніме сваё вэто на скліканьне падрыхтоўчае камісіі па разброеньню на 21 студзеня 1929 году, дзе павінна быць разгледжана другая прапанова савецкага ўраду хоць аб частковым разбраеньні? Ні для каго-ж не сэкрэт, што толькі супраціўленьне французскага ўраду перашкаджае скліканьню гэтае камісіі па разброеньню. Ясна, што Пуанкарэ застаўся тым-ж, чым і быў—ворагам Савецкага Саюзу, першым застрэльшчыкам па падрыхтоўцы новае сусьветнае бойні. Але што-ж азначае тады гэтая заява Пуанкарэ ў палаце дэпутатаў, што ён гатоў разбройвацца, калі савецкі ўрад згодзіцца на ўсеагульнае разбраеньне? Што гэтыя прыгожыя словы, якія ня маюць пад сабой ніякай падставы? Вядома не. За гэтымі словамі хаваецца палітычны манэўр вялікай важнасьці; гэтыя словы азначаюць, што французкі імпэрыялізм адначасова в падрыхтоўкаю матар'яльнаю прыступае і да стварэньня псыхічнае атмасферы, спрыяючай адчыненьню ваенных дзеяньняў супроць Савецкага Саюзу.

І сапраўды, уся гэта падрыхтоўка да вайны—падарожжа генэрала Лерона, вялізныя выдаткі на ўзбраеньне, частковае павялічэньне арміі і г. д.—усяго гэтага ад грамадзкае думкі скрыць далей немагчыма. Гэтая грамадзкая думка—асабліва яе перадовая частка—пачынае хваляваца, пачынае патрабаваць тлумачэньняў ад ураду.

І вось пускаецца ў ход стары, як сьвет, манэр, дасканала выпрабаваны ўжо і ў апошнюю імпэрыялістычную вайну.

— Мы ваяваць ня хочам,—сьпяваюць на ўсе спосабы імпэрыялісты, мы вельмі міралюбча настроены. Але вось, бачыце, Савецкі Саюз ня хоча разбройвацца. Ён рыхтуецца да вайны, ён хоча парушыць мір у Эўропе. І вось для адпору „азіятам" і нам прыходзіцца узбройвацца, і нам прыходзіцца рыхтавацца да ўсякіх выпадковасьцяў. Гэтага вымагае «гонар» французкае нацыі як абаронцы эўрапейскай „культуры". І гэтак далей, і гэтак далей.

Так ідэалёгічна падрыхтоўвае французкі мілітарызм сваю грамадзкую думку да вайны з Савецкім Саюзам. І з гэтага боку выступленьне Пуанкарэ ў французкай палаце дэпутатаў зьяўляецца вельмі паказальным.

К. Белінэ-Падгаецкі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

ВЫБУХ У БУДЫНКУ ЛЬВОЎСКАЕ ПОЛЬСКАЕ ГАЗЭТЫ.

ВАРШАВА, 6-12. Польскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе, што ўчора ў Львове ў памяшканьні газэты «Слово польске» здарыўся выбух пакунку, перададзенага кіраўніку друкарні пасьлыным. Кіраўнік паранен. Пакой, дзе здарыўся выбух, часткова зруйнаваны.

З гады турмы за прыналежнасьць да кампартыі.

Варшаўскі акруговы суд прысаварыў С. Кайзэрмана на 3 гады турмы за прыналежнасьць да кампартыі.

Скандальныя выкрыцьці.

На пасяджэньні бюджэтнай камісіі сойму пасол Трамчынскі заявіў аб сьвядомым фэйке набіцьця афіцэрыі пасла сойму п. Зьдзехоўскага: „На пасяджэньні рады міністраў, у якім прымалі ўдзел: марш. Пілсудзкі, прак. Гюбэр, ген. Давец, прэм'ер Бартэль, мін. Мойштовіч і іншыя асобы не магло быць мовы аб утрыманьні таямніцы". Прамоўца дзівіцца, што прэм'ер Бартэль не згадзіцца, быццам марш. Пілсудзкі выказаў жаданьне сьпіць сьледства проці вінаватага нападу на пасла Зьдзехоўскага. Трамчынскі шчэ раз сьцьвердзіў, што марш. Пілсудзкі, дзякуючы ген. Данца за інфармацыі, сказаў: «Што я буду рабіць з мін. вайсковых спраў, які мне скажа, што яму рабіць з арміяй»

Забойства ў бэльвэдэрскім парку.

«Газ. Варш.» (№ 361) паведамляе, што ўначы з 4 на 5 лістапада ў 20 кроках ад бэльвэдэрскага дварца (у якім жыве м. Пілсудзкі) знойдзен труп жандара. Перад гэтым у лазенкаўскім садзе, які прымыкае к бэльвэдэрскаму двару, чуты былі рэвальверныя выстралы. У будны стражы знойдзен нейкі Сьпявак Касоўскі, пры якім знойдзен рэвальвер сыстэмы „Сьміт і Вэссон" з трыма набоямі. Арыштаваны ня прызнаўся да віны.

Проці паядынкаў.

З прычыны эпідэміі паядынкаў у Польшчы соймавая фракцыя ППС уносіць у сойм праэкт закону аб трактаваньні забойства на дуэлі, як звычайнага забойства; пасрэдны ўдзел у паядынку—у якасьці сэкундантаў—будзе трактавацца, як садзейнічаньне забойству. Афіцэры будуць звальняцца з арміі і г. д.

Арышты ў Валожынскім і Маладзечынскім пав.

27 лістапада, у в. Малыя Запруды, Валожынскага пав., арыштаваны Г. Сідаровіч і А. Белыка, пры якіх знойдзена зброя. Яны быццам сазналіся, што хацелі забіць нейкага Язэпа Сьлізя. У рэзультаце далейшых допытаў арыштав ны ў Маладзечынскім пав.: М. Міцько, Я. Картінові, Я. Божко, П. Камаўчук, Гр. Сакалоўскі, Гр. Семашкевіч, А. Самаля, Ул. Сілаўскі, М. Высоцкі і Ул. Міцько.

Вязьні ўцяклі з астрогу.

Да сьледчай управы ў Кракаве надышла вестка, што з бэльскага астрогу ўцякло некалькі вязьняў, якія выламалі краты ў вакне на першым паверсе. Між зьбегшымі знаходзіцца грозны бандыт Дзюра.

Забастоўка ў фабр. Пэ-пэ-жэ.

Ужо ад 28 лістапада г. г. у гумовай фабрыцы «Пэ-пэ-жэ» абвешчана забастоўка. Работнікі выставілі даманьні падвышкі платы. На адбытай нядоўна канфэрэнцыі ў інспэктараце працы да паразуменьня ня дойшло.

У Саюзе ССР.

ПРАФСАЮЗЫ І ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ МАЮЦЬ АДЗІНЫ ШЛЯХ

ПА ПРАЯВАХ ШАВІНІЗМУ, АНТЫСЭМІТЫЗМУ І ПАПОЎШЧЫНЫ ЎДАРЫЦЬ УСЯ РАБОЧАЯ КЛЯСА

ХАРКАЎ, 6-12. Усеукраінові зьезд прафсаюзаў паслаў сёньня прывітальныя тэлеграмы на імя ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)У і УЦСПС.

У тэлеграмах да ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)У, між іншым, зазначана: „Прафсаюзы Украіны заяўляюць ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)У, што шлях, на якім ідуць украінскія прафарганізацыі, гэта—ШЛЯХ ЛЕНІНА. Генэральны напрамак партыі на індустрыялізацыю краю і на сацыялістычную перабудову вёскі зьяўляецца і генэральным напрамкам прафсаюзаў. У барацьбе за наўхільнае правядзеньне гэтага напрамку прафсаюзы давалі і заўсёды будуць даваць рашучы адпор усім дробна-буржуазным ухілам і цярпімым адносінам да іх.

У барацьбе з правым небясьпечнаю саюзы будуць верным памоцнікам партыі».

„Прафсаюзы Украіны заяўляюць, што яны дадуць рашучы адпор усім спробам здрадзіць варожую пралетарыяту ідэалёгію—нацыянальны шавінізм, вялікадзяржаўны нацыяналізм, антысэмітызм, папоўшчыну, зьменавехаўства. Прафсаюзы Украіны заявяяюць ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)У, што ўсе урокі Арцёмаўску, смаленскае і шахцінскае справы імі ўсвоены, што ўсю сваю энэргію яны накіруюць на ажыцьцяўленьне вёсьнгаў самакрытыкі і на шырокае прыцягненьне мілённых мас рабочых да сацыялістычнага будаўніцтва».

АНГЕЛЬСКІЯ ФІРМЫ ПРАПАНУЮЦЬ „СВАЕ ПАСЛУГІ."

ЛЕНІНГРАД, 6-XII. Ленінградзкае аддзяленьне Усесаюзна-Заходняе гандлёвае Палаты пасьля зацяжнога перапынку атрымала ліст ад Расейска-Брытанскае Гандлёвае Палаты. Палата прапануе аднавіць зносіны і цікавіцца рознымі пытаньнямі, зьвязанымі з разьвіцьцём камэрцыйных узаемадачыняньняў між савецкімі гаспадарчымі арганізацыямі і ангельскімі фірмамі.

Найлепшыя ў сьвеце.

ЛЕНІНГРАД, 6-XII. Завод Макса Гельца атрымаў ліст ад выбарскага таварыства тытунёвых фабрыкантаў аб якасьці 3 савецкіх папяросна-набіўных машын падвойнага руху, пасланых нядаўна ў Фінляндыю. У лісьце фабрыканты паведамляюць, што савецкія машыны зьяўляюцца самымі найлепшымі ў сьвеце. Адна з іх ужо працуе ў Выбарзе і набівае за 7-мігадзінны рабочы дзень 128 тысяч папярос.

Фінскія фабрыканты выказваюць упэўненасьць, што ў далейшым усе тытунёвыя машыны ў Фінляндыі будуць заменены ленінградзкімі.

РАБСЕЛЬКОРЫ-ЗАСТРЭЛЬШЧЫКІ НОВАГА БЫТУ

Прывітаньне ўсесаюзнай рабселькораўскай нарадзе ад М. Горкага.

МАСКВА. 6-га сьнежня на ўсесаюзнай нарадзе рабселькораў з прывітальнаю прамоваю выступіў нарком асьветы РСФСР т. Луначарскі, які гаварыў пра задачы культурнае рэвалюцыі і пра ролю рабселькораў у ёй.

Загадчык Дзяржаўнага Выдавецтва РСФСР Халатаў перадаў нарадзе прывітаньне, прысланае ад Максіма Горкага і нажаданьні адважнасьці ў барацьбе за культуру.

Тав. Сямашка намеціў задачы рабселькораў у справе будаўніцтва новага здаровага быту.

На гэтым пасяджэньні выступіла з заключным словам т. Ульянава.

Дадатковы прыём на хэмічныя факультэты ВНУ.

МАСКВА, 6-XII. Галоўная управа вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў ВСНГ СССР і галоўная управа прафсаюзнае асьветы РСФСР абвяшчаюць дадатковы прыём НА ХЭМІЧНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ І АДДЗЯЛЕНЬНІ Хэміка-Тэхналёгічнага Інстытуту імя Мэндэлеева ў Маскве, Маскоўскага Вышэйшага Тэхнічнага Вучылішча, Тэхналёгічнага Інстытуту імя Ленінградзкага савету, Маскоўскага Інстытуту Народнае Гаспадаркі імя Пляханава, Ніжагародзкага

Аб задачах партарганізацыі ў перавыбарчую кампанію саветаў.

Даклад тав. ГАНТМАНА на пленуме ЦК КП(б)Б 30-XI-1928 г.

Арганізацыйныя моманты ў перавыбарчай кампаніі.

Таварышы. Я ня буду спыняцца на цэлым шэрагу пытаньняў арганізацыйнага парадку, якія прапрацаваны Цэнтральнаю Выбарчаю Камісіяю і Прэзыдыумам ЦВК. Змушан толькі падкрэсьліць, што гэтыя арганізацыйныя моманты перавыбарчай кампаніі саветаў маюць надзвычайна вялікае значэньне.

Калі мы возьмем, здавалася-б, гэткае элемэнтарнае пытаньне, як разьбіўка на выбарчыя вучасткі—чыста арганізацыйнае пытаньне, дык разам з тым гэтае пытаньне мае вельмі вялікае значэньне ў перавыбарчай кампаніі саветаў.

У працэс падрыхтоўкі да дакладу мне прышлося азнаёміцца з артыкулам тав. Ангарава, які быў зьмешчаны ў „Зборніку да перавыбараў саветаў", дзе ён зусім правільна адзначыў, і я памятаю, з нашай практыкі, што кулацтва ў шэрагу выпадкаў скарыстала нашы арганізацыйныя хібы ў сэнсе пабудовы вучасткаў у сваіх чыста клясавых інтарэсах для таго, каб забясьпечыць сабе правядзеньне тэй ці іншай кандыдатуры.

Ёсьць цэлы шэраг і іншых пытаньняў арганізацыйнага парадку, якія таксама, бясспрэчна маюць вялікае значэньне і ад правільнага правядзеньня якіх залежыць пасьпяховы ход і вынікі перавыбараў. Пагэтаму, ня спыняючыся на гэтых пытаньнях, я ўсё-ж лічу неабходным зьвярнуць увагу акруговых камітэтаў партыі і партарганізацый уцэлым на гэтыя арганізацыйныя моманты.

Перавыбары саветаў заўсёды зьяўляюцца надзвычайна важнай паласой у нашым палітычным жыцьці, бо пры перавыбарах саветаў мы мелі вельмі шырокую магчымасьць прыцягнуць самыя шырокія пласты рабочае клясы і сялянства да праверкі ўсёй працы, якая праводзілася за пэўны працяг часу.

Адной з асаблівасьцяў савецкай сыстэмы зьяўляецца надзвычайна моцная сувязь выбарчых органаў дзяржаўнага кіраўніцтва з шырокімі масамі. Вядома, няма ніякай неабходнасьці тут, па пленуме ЦК, параўноўваць нашу савецкую сыстэму з сыстэмаю парляманцкіх выбараў, нават найбольш «дэмакратычных» буржуазных краін. Увесь сэнс буржуазных выбараў зьмяшчаецца ў тым, каб абдурыць, ашукаць выбаршчыка. Для гэтай мэты пускаецца ў ход уся буржуазная дзяржаўная машына хлусьні і ашуканства.

Ва ўмовах рабочае дзяржавы зусім іншае: тут перавыбарчая кампанія саветаў садзейнічае прыцягненьню самых адсталых пластоў працоўных, нават тых, якія ў моц сваёй адсталасьці ў звычайны пэрыяд часу пасыўны ў палітычным і грамадзкім жыцьці.

Прыцягваючы шырокія масы на справаздачныя сходы, да абгаварэньня ўсёй працы саветаў, мы праз шырокія масы працоўных правяраем палітычную лінію саветаў, правяраем правядзеньне гэтай палітычнай лініі ў практычнай працы.

Перавыбары саветаў зьяўляюцца лепшым і найпэўнейшым сродкам узмацненьня саюзу рабочае клясы з сялянствам. Прыцягваючы бяднейшае і сярэдняе сялянства да ўдзелу ў кіраваньні дзяржаваю, зразумела, пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе авангарду—камуністычнае партыі, мы яшчэ больш узмацняем саюз пралетарыяту з бядняцка-сераднякцкімі масамі вёскі.

Такім чынам, таварышы, перавыбары саветаў зьяўляецца надзвычайна важнай палітычнай кампаніяй. Меншавіцкія „жрацы" з «Сацыялістычнага Весьніка» ўжо адгукнуліся на перавыбарчую кампанію саветаў і разводзяць усякае бязглуздзьдзе вакол перавыбараў саветаў і прадказваюць усялякія няшчасьці і крахі савецкай улады. Яны столькі разоў намыляліся наконт моцнасьці савецкае ўлады і нікога з нас гэта ні ў якой меры ня турбуе.

Зразумела, мы ніколі не разглядалі іншы перавыбарчай кампаніі саветаў, як важнейшую паласу ў нашай палітычнай працы, мы заўсёды разглядалі перавыбары саветаў таксама, як і ўсякую іншую буйную гаспадарчую ці палітычную кампанію ў умовах Савецкага Саюзу ў сэнсе клясавае барацьбы.

Нас ні ў якой меры ня турбуюць усе гэтыя меншавіцкія прадказваньні, што тут нешта крыецца, што калі абвясьцілі перавыбары саветаў, як буйнейшую палітычную кампанію, значыцца, трудна прышлося партыі і савецкай уладзе.

Неабходна крыху спыніцца на некаторых асаблівасьцях перажываемага пэрыяду. Гэта неабходна зрабіць для таго, каб больш правільна вызначыць нашы палітычныя задачы ў надыходзячых перавыбарах саветаў. Аб гэтым трэба сказаць хоць некалькі слоў.

Я ня буду, таварышы, спыняцца на тых зьменах, якія зьявіліся ў выніку вялізнага эканамічнага росту Савецкага Саюзу і на тых гаспадарча-палітычных задачах, якія стаяць перад намі ў бягучай паласе. Шырокае разгортваньне нашага сацыялістычнага будаўніцтва, эканамічны наступ на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі—ставіць перад намі цэлы шэраг новых задач, высоўвае перад намі цэлы шэраг новых лёзунгаў, якія павінны знайсьці сваё праломленьне ў перавыбарчай кампаніі саветаў, вакол якіх мы павінны згуртаваць самыя шырокія масы рабочае клясы і бядняцка сераднякцкіх пластоў вёскі.

Я ня буду закранаць таксама тых пасьпехаў, якія ў нас ёсьць у галіне згуртаваньня беднаты ў вёсцы. У гэтай адносіне прароблена значная праца ў параўнаньні з тым становішчам, якое мы мелі два гады таму назад, пры мінулых перавыбарах саветаў, калі мы толькі пачалі гэту працу па арганізацыі і павялічэньні палітычнае актыўнасьці беднаты. У параўнаньні з тым пэрыядам мы пасунуліся наперад.

Вядома, у гэтай працы ёсьць яшчэ вялікія недахопы, мне аб іх прыдзецца яшчэ ўспамянуць далей, калі я закрану задачы арганізацыі беднаты ў гэтай перавыбарчай кампаніі. Але бясспрэчна, што мы зробім буйны крок наперад. Нам удалося ў выніку гэтых двух год працы дабіцца падвышэньня палітычнай грамадзкай актыўнасьці бядняцкіх пластоў вёскі, нам удалося яшчэ больш узмацніць саюз беднаты з сераднякам, і, зразумела, што гэтая надыходзячая перавыбарчая кампанія саветаў дае нам вялізарную перавагу у параўнаньні з мінулым, дае нам магчымасьць зараз значна больш арганізавана выступіць на выбарах у вёсцы.

Я ня буду закранаць таксама таго вялікага ўздыму палітычнае актыўнасьці, які мы маем сярод рабочае клясы і ў пэўнай меры таксама і сярод бядняцка-сераднякцкіх пластоў вёскі.

Гэты рост палітычнае актыўнаўсьці, шырокае прыцягненьне мас працоўных да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, прыцягненьне новых шырокіх пластоў да непасрэднага ўдзелу ў справе кіраваньня дзяржаваю—усё гэта таксама значна ўзмацняе пазіцыі пралетарыяту ў гэтай перавыбарчай кампаніі саветаў.

Але, таварышы, самае асноўнае, што адрозьнівае гэты пэрыяд ад таго, які мы мелі ў мінулых перавыбарах, гэта тое, што на аснове эканамічнага і палітычнага наступу на капіталістычныя элемэнты, мы, бязумоўна, маем абвастрэньне клясавае барацьбы і ў надыходзячай перавыбарчай кампаніі саветаў, гэта абвастрэньне клясавай барацьбы павінна адбіцца ў яшчэ больш вострай форме.

Мы ўсе ведаем, што саветы зьяўляюцца сапраўдным ўвасабленьнем дыктатуры пралетарыяту, і таму барацьба вакол саветаў, барацьба за правядзеньне сваіх кандыдатур з боку варожых клясаў набудзе ў перавыбарчую кампанію саветаў больш вострыя, больш заядлыя формы.

Тут мне хацелася спыніцца на некаторых настроях, якія ўжо выявіліся сярод паасобных таварышоў у сувязі з надыходзячымі перавыбарамі саветаў. Ёсьць асобныя таварышы, якія вельмі перабольшваюць небясьпеку з боку кулака, якія пераўвялічваюць цяжкасьці. Зразумела, што гэткага роду адносіны, што пераўвялічэньне цяжкасьцяў, перабольшка сіл нашых ворагаў зьяўляецца вельмі шкодным настроем, супроць якога неабходна самым рашучым чынам змагацца. Але, з другога боку, ёсьць шэраг іншых настрояў, што мы з перавыбарамі справімся, што не ўпяршыню праводзім перавыбары саветаў і г. д. З гэткаю-ж рашучасьцю трэба змагацца супроць гэтых настрояў, якія зьяўляюцца ні чым іншым, як недабрэнкаю клясавае барацьбы.

Я тут маю пад рукамі цэлую сводку, якая характарызуе ўзмацненьне тэрору і падрыхтоўку з боку кулацкіх груп вёскі. Зусім правільна тав. Гамарнік у сваім дакладзе падкрэсьліў, што пазіцыі пралетарыяту ўзмацняюцца, мы эканамічна і палітычна робім наступ на капіталістычныя элемэнты, наш вораг слабее. Гэта зусім бясспрэчна, і тэрор зьяўляецца адным з спосабаў выяўленьняў, якое характарызуе аслабленьне нашых ворагаў.

З другога боку неабходна памятаць, што адпор з боку клясавага ворага ўзмацняецца, і думаць, што кулак і ў надыходзячую перавыбарчую кампанію будзе ўжываць толькі тэрор, ня ўжываючы іншых мэтадаў і формаў барацьбы, зусім ня прыходзіцца.

Я маю цяпер напагатове матар'ялы выступленьняў кулацкіх і антысавецкіх элемэнтаў у мінулай перавыбарчай кампаніі саветаў. Адзін з многіх прыёмаў барацьбы, якія ўжываў кулак—гэта націск на некаторых беднякоў эканамічна. Ёсьць цэлы шэраг фактаў, якіх пералічаць ня трэба, кожны з таварышоў, які ўдзельнічаў практычна ў перавыбарах саветаў, ведае, што мела месца запалохваньне на гэтым грунце: „Калі будзеш галасаваць за такую кандыдатуру, табе гэта прыпомніцца, калі табе будзе патрэбны хлеб" і г. д.

Можна лічыць, што ў надыходзячую перавыбарчую кампанію саветаў гэты націск з боку вясковага кулака на некаторыя бядняцкія і незаможныя сераднякцкія групы па лініі эканамічнай набудзе яшчэ больш шырокія разьмеры.

Тут трэба грунтавацца на цэлым шэрагу гаспадарчых цяжкасьцяй, якія мы мелі ў адносіне дастаўкі. На грунце гэтых гаспадарчых цяжкасьцяй, бясспрэчна, можна лічыць, што спробы націску на гэтай лініі, па лініі эканамічнай, будзе мець больш шырокія разьмеры, чымся ў мінулым.

У мінулым мы мелі цэлы шэраг фактаў, калі кулацтва на вёсцы выступала пад выглядам абаронцаў інтарэсаў беднаты; нам удалося сабраць шмат фактаў падобнага парадку, калі кулак прыкідваўся „абаронцам беднаты": «Я вось заплачу падатак, але як бядняк заплоціць падатак; камуністы пра беднату паюць і нічога не даюць, трэба павялічыць выдачу драўнины, апалу бедняку; я вось маю магчымасьць купіць, але бядняк ня можа купіць апалу» і г. д.

Адным словам, шэраг яскравых фактаў, калі кулацтва прыкідвалася «абаронцам» беднаты.

Можна лічыць, што кулацтва і ў надыходзячую перавыбарчую кампанію саветаў у большасьці выпадкаў усё-ж будзе дзейнічаць такім чынам, будзе дзейнічаць ціпком.

Гэта неабходна ўлічыць са ўсёй сур'ёзнасьцю. Нам, зразумела, цяжка пакуль прадугледзець і прадбачыць усе тыя рознастайныя формы і прыклады, якія будзе ўжываць наш клясавы вораг і ў горадзе і на вёсцы. Гэта надзвычайна цяжка прадугледзець, тым больш, што гэтыя мэтады і формы вельмі розныя, у залежнасьці ад цэлага шэрагу ўмоў, якія маюцца ў тым ці іншым раёне.

Я закрануў гэта пытаньне таму, што неабходна зазначыць, што ў мінулую перавыбарчую кампанію саветаў мы недастаткова займаліся вывучэньнем тактыкі нашых клясавых ворагаў, а гэта справа надзвычайна важная.

Я-б мог падаць цэлы шэраг выпадкаў, калі многія т. т. камуністы, якія пасылаліся для кіраўніцтва перавыбарамі саветаў, з даверлівасьцю адносіліся да выступленьняў асобных сераднякоў, а іншы раз і бедняка, якія адбівалі цалкам кулацкія настроі. Таварышы ў гэтых выпадках прыходзілі ў замешаньне і ня выкрывалі адваротнага боку гэтых выступленьняў.

Гэта адбывалася, галоўным чынам, таму, што таварышы недастаткова прыглядзеліся да тактыкі кулака, недастаткова вывучылі яго мэтады і прыёмы і таму, зразумела, не маглі так глыбока, так яскрава яго выкрываць і выкрываць увесь адваротны бок усіх гэтых выступленьняў.

Таму нам неабходна ў гэту перавыбарчую кампанію саветаў зьвярнуць на гэту справу самую сур'ёзную ўвагу, прыглядзецца бліжэй да тых ці іншых прыёмаў кулацтва, дамагчыся поўнае ізаляцыі кулацтва і ўсіх антысавецкіх элемэнтаў.

Агульны вывад, які неабходна зрабіць адгэтуль, гэта тое, што ў надыходзячую перавыбарчую кампанію саветаў партыйным, савецкім і ўсім іншым грамадзкім арганізацыям неабходна падрыхтавацца са ўсёй рашучасьцю.

Больш актыўнасьці ў падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў.

Неабходна цяпер-жа ўзьняць актыўнасьць усіх нашых арганізацый у падрыхтоўцы перавыбараў. Я маю на ўвазе шырокія масавыя арганізацыі—прафсаюзы, камсамол, дэлегацкія сходы, Чырвоную армію, каапэрацыю, грамадзкія арганізацыі, масавыя таварыствы, у першую чаргу шэфскія арганізацыі, якія павінны адыграць вялікую ролю, і ўсе іншыя нашы масавыя арганізацыі ў вёсцы, як камітэты сялянскай узаемадапамогі і інш.

Пленум Цэнтральнага Камітэту партыі, калі падагульваў вынікі мінулай перавыбарчай кампаніі саветаў, павінен быў адзначыць усё-такі недастатковую актыўнасьць усіх гэтых арганізацый, недастатковы ўдзел з боку гэтых арганізацый у перавыбарах саветаў. Калі прафсаюзы ў горадзе, у рабочай масе, сярод членаў прафсаюзаў, працуючых у горадзе, праводзілі працу, то роля і праца прафсаюзаў у вёсцы, сярод пралетарскіх груп вёскі, сярод членаў прафсаюзаў там значна слабей адчувалася. Калі мы возьмем батрацтва, с.-г. рабочых і работніц, сельскую інтэлігенцыю (настаўніцтва, спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы, дактароў і г. д.), дык арганізацыйная і масавая праца сярод іх з боку прафарганізацый была далёка недастатковая. Ды і ў горадзе асноўная ўвага прафсаюзаў накіроўваецца ў бок прыцягненьня рабочай масы на перавыбарчыя сходы, галоўным чынам, у бок павялічэньня процанту выбаршчыкаў на выбарах. Гэта, зразумела, надзвычайна важна; прафарганізацыі павінны сёлета зьвярнуць вялікую ўвагу на задачу большага прыцягненьня рабочых мас, членаў прафсаюзаў на справаздачныя і перавыбарчыя сходы, але гэтым ня вычэрпваецца задача прафэсыянальных арганізацый. Яны павінны прыняць значна больш глыбокі ўдзел, павінны садзейнічаць працы па ўзьняцьцю актыўнасьці ўсёй масы рабочых членаў прафсаюзаў у абмеркаваньні справаздачных дакладаў, палітычных задач і ў правядзеньні наглядзенай масавай палітычнай працы сярод усей саюзнай масы як у горадзе, так і ў вёсцы.

Калі мы возьмем некаторыя іншыя нашы арганізацыі, як, напрыклад, шырокую грамадзкую арганізацыю ў вёсцы—камітэты сялянскай узаемадапамогі, дык іх удзел у мінулай кампаніі перавыбараў саветаў адчуваўся слаба, яны не праводзілі масавай працы, ня выступалі па выбарах як масавая арганізацыя. Тое самае і шэфтаварыствы, якія могуць надзвычайна многа зрабіць у сэнсе ўзмацненьня рабочага ўплыву ў вёсцы на бяднейшыя і сераднякцкія пласты вёскі, палегчыць нашу задачу па растлумачэньню палітычных задач, мы тут зноў такі мелі нездавальняючае становішча ў мінулым. І вось адна з асноўных задач, якая стаіць перад партыйнымі арганізацыямі,—гэта прывесьці ў рух усе гэтыя прыводныя рамні—ад партыі да рабочае клясы, да асноўнай масы сялянства, усе гэтыя масавыя арганізацыі, якія аб'ядноўць у сваіх шэрагах дзесяткі тысяч рабочых і сялян Беларусі, неабходна павялічыць іх актыўнасьць у надыходзячай перавыбарчай кампаніі саветаў.

Прафэсыйным арганізацыям у першую чаргу неабходна паставіць задачу ня толькі самага актыўнага ўдзелу ў правядзеньні перавыбараў саветаў у горадзе, але і ўзмацненьня пралетарскага ўплыву ў вёсцы на бяднейшае і сераднякцкае сялянства.

Мы ведаем, што ў Беларусі мы маем досыць значную групу рабочых, зьвязаных з вёскаю. Мы маем округі, дзе ня менш 30-35 проц. рабочых жывуць стала ці часова ў вёсцы, зьвязаны з вёскаю. І калі-б мы змаглі гэтую досыць значную групу рабочых як след падрыхтаваць, растлумачыць ім палітычныя задачы, якія стаяць у вёсцы, мы-б, бязумоўна, дабіліся надзвычайна многага ў сэнсе ўзмацненьня пралетарскага ўплыву на сялянства. У мінулым мы мелі факты, калі тая ці іншая асобная група рабочых часамі зрывала мерапрыёмствы партыі, што праводзяцца ў вёсцы. Мы мелі некалькі выпадкаў у часе правядзеньня самаабкладаньня ў вёсцы. Праўда, гэта адзінкавыя факты, але факты, аднак, трывожныя, якія характарызуюць слабасьць нашай палітычнай працы сярод груп рабочых, якія маюць непасрэднае дачыненьне з вёскаю. Такія рабочыя на прадпрыёмстве часамі выступаюць, як перавейшыя пралетарыі: і ў пазыцыі індустрыялізацыі ўдзельнічаюць актыўна і г. д., але як толькі нападаюць у вёску, яны пачынаюць разважаць, як сяляне, часамі як кулакі. Я лічу, што гэта тлумачыцца галоўным чынам тым, што мы дрэнна абслугоўваем гэту групу рабочых, якая ў нас, ва ўмовах Беларусі, зьяўляецца досыць значнаю.

У гэту перавыбарчую кампанію саветаў неабходна гэтыя задачы паставіць перад прафарганізацыямі. Яны павінны несьці адказнасьць за гэтую справу, зразумела, поруч з партыйнымі ячэйкамі на прадпрыёмствах. Прафсаюзы павінны падрыхтаваць гэтыя групы рабочых так, каб яны былі актыўнымі памоцнікамі партыі ў правядзеньні кампаніі перавыбараў саветаў, каб яны прымалі актыўны ўдзел у перавыбарах, на сходах беднаты, каб яны ня трымаліся пасыўна на справаздачных дакладах і адбівалі-б дастаткова поўна клясавую пралетарскую лінію.

За палепшаньне дзяржаўнага апарату.

Адна з цэнтральных задач, якая стаіць перад намі ня толькі ў надыходзячай перавыбарчай кампаніі саветаў, а якая будзе стаяць перад намі на ўвесь будучы пэрыяд перавыбараў саветаў,—доўгая задача, якую мы павінны асабліва выпукліць перад шырокімі масамі: гэта барацьба за палепшаньне і аздараўленьне нашага дзяржаўнага апарату. Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б), у пастанове аб упарадкаваньні сацыяльнага складу партыі, наступным чынам характарызуе стан савецкага апарату:

«Сучасны савецкі апарат яшчэ моцна праросшы элемэнтамі старога чыноўніцтва, рэшткамі раней пануючых клясаў... у якіх яшчэ жыве нянавісьць да савецкага ладу» і г. д.

Гэта надзвычайна яскравая характарыстыка таго становішча, якое мы маем у дзяржаўным апараце, і трэба сказаць, што мы, бясспрэчна, на пытаньню адносна барацьбы з бюракратызмам, барацьбы за палепшаньне дзяржаўнага апарату, за аздараўленьне яго, гаворым ужо досыць доўгі пэрыяд часу, гаворым, але мы ня маем яшчэ вялікіх дасягненьняў у гэтым напрамку. Куды-б мы ні пашлі,—на рабочы сход, у вёску—на сялянскі сход, калі пытаньне пастаўлена адносна палітыкі партыі і рабочае клясы, мы тут сустракаем поўнае адобраньне, поўнае падтрыманьне, зразумела, з боку пралетарскіх і асноўных мас сялянства.

Але калі гутарка ідзе адносна тых ці іншых зьвеньняў нашага дзяржапарату, мы чуем зусім справядлівыя нарэканьні.

І тут мы маем, бязумоўна, вялікае разыходжаньне паміж цэлым шэрагам рэзалюцый і дырэктыў, якія дадзены партыяй, якія мы паўтараем вельмі часта,—і практычнымі вынікамі—славутыя „ножніцы", якія, бязумоўна, неабходна, чаго-б гэта ні каштавала, зблізіць і шчыльна зачыніць.

Практычная, жывая праца па ўзмацненьню нашага дзяржапарату праводзіцца ўсё-такі надзвычайна слаба, і лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) завастрыў увагу ўсёй партыі на гэтым пытаньні, як на адной з цэнтральных, на аднэй з важнейшых задач. Я думаю, што перавыбарчая кампанія саветаў павінна праводзіцца пад лёзунгам прыцягненьня ўсёй пралетарскай грамадзкасьці да энэргічнага ўдзелу ў палепшаньні дзяржапарату, па барацьбе з бюракратычнымі скажэньнямі дзяржапарату, на бязьлітаснаму выяўленьню бюракратычных элемэнтаў. Мы часамі зусім міма праходзім, не зварачваем увагі на чыноўнікаў-бюракратаў, якія сядзяць у савецкім апараце і праводзяць сваю лінію, лінію клясавага ворага.

І самае асноўнае, зразумела, тое, што некаторыя камуністы, якія працуюць у дзяржапараце, часта губляюць клясавае пачуцьцё, падпадаюць пад уплыў гэтых чыноўнікаў, у шмат выпадках несьвядома і прыкрываюць гэты бюракратызм, бяруць яго на сябе. Таму партыя зьвязвае гэту задачу аздараўленьня дзяржаўнага апарату з чысткаю партыі. Чыстка партыі будзе накіравана і супроць такіх камуністаў, якія губляюць клясавае пачуцьцё, адрываюцца ад мас, разлагаюцца і робяцца бяздушнымі чыноўнікамі.

Мы павінны ў будучую перавыбарчую кампанію саветаў, апроч вялікай працы, палітычнай масавай працы, якая праводзіцца вакол гэтага пытаньня, ажыцьцявіць шэраг мерапрыёмстваў па далейшаму аздараўленьню савецкага апарату. Я маю на ўвазе ўцягваньне новых пластоў рабочых, батракоў і беднякоў у савецкі апарат, праводзячы шырокую працу ў гэтым напрамку.

Аддаючы належную ўвагу правядзеньню перавыбарчай кампаніі саветаў у горадзе, нам неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на перавыбарчую кампанію саветаў у вёсцы. Улічваючы, што нашы партарганізацыі ў вёсцы слабыя, улічваючы, што там уплыў нашага клясавага ворага часамі мацнейшы, мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу і вялікую дапамогу аказаць нашым вясковым арганізацыям.

Шырэй арганізацыю вясковай беднаты.

Неабходна шырока ўцягнуць батрацтва ў перавыбарчую кампанію саветаў. У мінулую перавыбарчую кампанію саветаў уцягнута было ня больш паловы батрацтва. Мы павінны паставіць перад сабой задачу ўцягнуць усю батрацкую масу, с.-г. рабочых—членаў прафсаюзу. Мы павінны паставіць перад сабой задачу арганізаваць калгасьнікаў, членаў каапэрацыі. Гэта задача ўскладаецца ў значнай меры і на каапэрацыйныя арганізацыі.

Належную ўвагу неабходна зьвярнуць па пытаньне арганізацыі і спайкі сялянскай беднаты. У гэтай працы нашы партарганізацыі маюць ужо вопыт.

Але, таварышы, ці можам мы сказаць, што мы справіліся поўнасьцю з гэтай задачай у мінулым? Бясспрэчна, не. Тыя лічбы, якія мы маем аб арганізацыі і актыўнасьці вясковай беднаты ў мінулую перавыбарчую кампанію, характарызуюць, што далёка ня ўся беднота прыцягнута была на бядняцкія сходы і прымала ўдзел у перавыбарах. Наогул, беднота складала крыху больш як 10 проц. ад агульнай масы выбаршчыкаў, а на бядняцкія сходы мы прыцягнулі крыху больш паловы беднаты; другая палова беднаты на бядняцкія сходы ня была прыцягнута.

Мы маем значна большы процант беднаты ў вёсцы і гэта сьведчыць аб тым, што нам не ўдалося ў мінулым перавыбары саветаў уцягнуць усю бядняцкую масу. Гэту задачу трэба паставіць перад сабой: прыцягнуць поўнасьцю бядняцкія масы на перавыбары саветаў. Нам неабходна глыбей растлумачыць палітычныя задачы сярод усёй масы вясковай беднаты. Нам неабходна ў гэтыя перавыбары саветаў узьняць яшчэ ў большай меры актыўнасьць беднаты. Мы мелі цэлы шэраг фактаў, калі бядняцкія сходы праводзіліся досыць пасьпяхова, намячаліся кандыдатуры, але на выбарчых сходах беднота стушоўвалася, недастаткова арганізавана выступала, г. зн. мы мелі шмат фактаў выяўленьня «палітычнай палахлівасьці» з боку некаторых бядняцкіх груп, якія ўступалі напору тых ці іншых асобных кулакоў.

Задачаю надыходзячай перавыбарчай кампаніі зьяўляецца ня толькі прыцягнуць усю беднату на бядняцкія сходы, але і глыбока растлумачыць ёй усе палітычныя задачы, якія стаяць перад намі, і ў далейшым яшчэ больш узьняць палітычную актыўнасьць беднаты.

Адна з важнейшых задач, якія стаяць перад намі—гэта далейшае ўзмацненьне саюзу пралетарыяту і беднаты з сераднякам. Я казаў з самага пачатку, што мы, бясспрэчна, будзем мець у гэтую кампанію перавыбараў саветаў з боку кулацтва спробы і імкненьне да таго, каб узяць пад свой уплыў тыя ці іншыя сераднякцкія групы. Барацьба за серадняка, бязумоўна, будзе больш заўзятаю, таму што беднота ўсё-ж арганізавана, у пераважнай большасьці выступае арганізавана, і кулацтва будзе імкнуцца ўсімі сіламі да таго, каб павесьці за сабой некаторыя групы сераднякоў. Мы ведаем з вопыту, што ў пэўныя пэрыяды некаторыя групы сераднякцкай верхавіны выяўляюць хістаньні. У пэрыяд хлебазагатовак, калі былі дапушчаны памылкі і скажэньні, калі праведзеныя супроць кулака меры, ударылі таксама і па некаторых пластох сераднякоў.

Гэтыя хістаньні ў сераднякцкай верхавіне былі заўважаны. Таму наша важнейшая задача па падрыхтоўцы перавыбараў саветаў у вёсцы—правядзеньне глыбокай працы сярод сераднякцкіх мас вёскі. Мы будзем рашуча змагацца супроць пераацэнкі гэтых хістаньняў з боку паасобных таварышоў, якія лічаць гэтыя хістаньні настолькі значнымі, што яны пагражаюць разрывам з сераднякам. Аднак ня ўлічваць гэтай небясьпекі—часовых хістаньняў асобных, хоць і пазначных груп сераднякоў—ніяк немагчыма.

Што мы павінны зрабіць у гэтую перавыбарчую кампанію для таго, каб у большай меры забясьпечыць і ўзмацніць гэты саюз з сераднякам?

У мінулыя перавыбары саветаў мы мелі цэлы шэраг фактаў скарг з боку сераднякоў на тое, што іх ня прыцягваюць, не дапускаюць на бядняцкія сходы.

Зразумела, мы ня можам прыцягнуць усіх сераднякоў на бядняцкія сходы, бо ў гэткім выпадку беднота ступавалася-б, яна-б у шмат выпадках страціла свой твар. Прыцягнуць незаможных сераднякоў на бядняцкія сходы неабходна, але, беднота не павінна траціць свой твар, беднота вырашае пытаньні пастаўленыя на бядняцкіх сходах, але ў той-жа час прыцягнуць гэтую сераднякцкую незаможную масу мы, бязумоўна, можам бяз усякай небясьпекі. Пры дастаткова глыбокай і шырокай працы сераднякцкіх мас вёскі, мы, таварышы, бясспрэчна, можам дабіцца, што гэтыя элістаньні сярод сераднякцкай верхавіны будуць найменшымі, і што мы будзем мець падтрыманьне пераважнай большасьці сераднякоў на выбарах.

Трэба абавязкова вялікую групу актыўных перадавых сераднякоў вылучыць і правесьці ў склад саветаў.

У гэтай перавыбарчай кампаніі мы ставім перад сабой задачу забясьпечыць батрацка і бядняцка-сераднякцкі склад саветаў, ізаляваць кулака, не дапусьціць яго ў склад саветаў, забясьпечыць у складзе саветаў пераважаючы ўплыў беднаты і батрацтва, аднак, прыцягваючы найбольш актыўных сераднякоў.

Трэба павялічыць удзел жанчын у перавыбарах саветаў.

Адна з важнейшых задач—гэта арганізацыя жаночых мас працоўных. Мы мелі ў мінулым недастатковы іх удзел, асабліва сялянак, у перавыбарах саветаў. Напрыклад, мы маем нават некаторае зьмяншэньне ліку жанчын у складзе сельскіх і местачковых саветаў; у 1926 годзе мы мелі 8,4 проц., у 27 г.—7 проц., хоць, праўда, мы маем павышэньне гэтае ліку старшынь сельсаветаў—жанчын з 11 да 14 процантаў (у абсалютных лічбах).

Што датычыць удзелу жанчын у перавыбарах саветаў, дык гэты процант, зразумела, недастатковы ў той час, калі процант удзелу мужчын у адносіне да ўсяе масы выбаршчыкаў-мужчын складае 66,5 проц., процант жанчын у адносіне да агульнае масы выбаршчыкаў жанчын усяго 16,7 пр. (у 27 г. па БССР).

Процант яўкі жанчын па сельскіх саветах: у 1924 годзе—21,2 проц., у 1925 г.—19,3 проц., у 1926 г.—24,2 проц. і ў 1927 г.—26,3 проц.; ня гледзячы на тое, што мы маем павялічэньне процанту яўкі жанчын на выбарчыя сходы, тым ня менш гэты процант удзелу—26, бязумоўна, нас ня можа задаволіць.

Мы ставім перад сабою задачу ў гэту перавыбарчую кампанію саветаў значна павысіць процант яўкі на выбары работніц, жонак рабочых, батрачак, сялянак-бяднячак і сераднячак. Для гэтае мэты неабходна ўсюды праводзіць папярэднія сходы ня толькі дэлегатак, але і ўсяе масы сялянак, батрачак, на якіх растлумачваць палітычныя задачы, што стаяць перад намі, значэньне перавыбараў саветаў, ролю саветаў, папярэдня абмеркаваць кандыдатуры актыву работніц, батрачак і сялянак у склад савету.

Прычым, зразумела, у гэтай працы нельга выяжджаць выключна на тым, што робіць жаночы аддзел,—гэта павінна быць задачай кожнага партыйнага камітэту, усёй партыйнай арганізацыі.

Роля камсамолу ў перавыбарчай кампаніі.

Асноўная задача камсамолу ў гэтай перавыбарчай кампаніі саветаў—у падрыхтоўцы і арганізацыі ўсяе масы моладзі. Калі камсамол і на ранейшых выбарах браў актыўны ўдзел у перавыбарчай кампаніі саветаў, дык у галіне арганізацыі і падрыхтоўкі ўсяе масы рабочае і сялянскае моладзі, батрацкае моладзі на вёсцы, задачы камсамолу ня зусім апраўдаліся. Мы ставім перад камсамолам гэту асноўную задачу—падрыхтоўкі ўсяе моладзі.

Апрача цэлага шэрагу задач агульна-палітычных, якія неабходна растлумачыць усёй моладзі, камсамол павінен высунуць перад моладзьдзю шэраг лёзунгаў і задач, накіраваных да палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў і культурнага ўздыму рабочае і сялянскае моладзі.

Перад усёй партыйнай арганізацыяй неабходна высунуць, як адну з важнейшых задач,—узьняцьце аўтарытэту дэпутатаў саветаў.

Пры перавыбарах саветаў неабходна строга кіравацца савецкім законадаўствам і строга захоўваць савецкую (пралетарскую) дэмакратыю. Мы мелі ў мінула перавыбарчай кампаніі шэраг фактаў, калі ў недастатковай меры захоўвалася савецкая дэмакратыя, мы мелі асобныя факты, калі тыя ці іншыя таварышы, якім даручана было правесьці перавыбары, са «скуры лезьлі» для таго, каб працягнуць усякімі законнымі і незаконнымі спосабамі зусім неаўтарытэтных кандыдатаў, дапускаючы вельмі грубае парушэньне савецкай (пралетарскай) дэмакратыі.

Таму ўзьняцьце аўтарытэту дэпутатаў савету, апроч нагрузкі кожнага з іх поўнаю практычнаю працаю, прыцягненьня кожнага члена савету да непасрэднага ўдзелу ў справе кіраваньня дзяржаваю, апроч вялікага скарыстаньня правоў адкліканьня негодных, не апраўдаўшых давер'я, дэпутатаў, неабходна забясьпечыць у гэту перавыбарчую кампанію саветаў вельмі строгае захаваньне пралетарскае дэмакратыі.

Гэта, зразумела, ня значыць, што партыя адмаўляецца ад кіраваньня перавыбарамі, і што фракцыі будуць адмаўляцца праводзіць свае кандыдатуры. Наадварот, кіраўніцтва з боку партыі, з боку фракцый, зьездаў і г. д. трэба ўзмацніць, але гэта павінна дапасоўвацца з захаваньнем пралетарскае дэмакратыі. Адно зусім ня выключае другога.

Які павінен быць склад саветаў.

Адносна складу саветаў. Мы маем рост партыйнай арганізацыі за гэтыя два гады. Такім чынам, мы маем усе даныя паставіць перад сабой задачу павялічыць процант камуністаў, камсамольцаў у складзе саветаў, асабліва сельсаветаў, бо ў гарадзкіх саветах акруговых гарадоў мы маем прыблізна сярэдні процант па ўсёй Беларусі—52 проц. камуністаў і 5,4 проц. камсамольцаў. Процант камуністаў і камсамольцаў саветаў неакруговых гарадоў крыху ніжэй. Неабходна, абавязкова прыцягнуць у склад саветаў новыя пласты рабочых ад вытворчасьці, але ў адносіне сельсаветаў мы лічым магчымым паставіць перад сабой задачу дабіцца павялічэньня процанту камуністаў і камсамольцаў у складзе саветаў, зразумела, пры ўмове поўнага захаваньня савецкае дэмакратыі, пры ўмове вылучэньня кандыдатур больш аўтарытэтных, у адносіне якіх падтрыманьне бядняцка - сераднякцкай масы будзе забясьпечана.

Мы павінны ўцягнуць у склад гарадзкіх саветаў новыя пласты рабочых ад вытворчасьці, павялічыць гэты процант, у мінулым ён быў недастатковым, складаючы ўсяго 25-28 процантаў у сярэднім па акруговых і неакруговых гарадох. Мы лічым гэта недастатковым. У сельсаветах забясьпечыць батрацка-бядняцка-сераднякцкі склад, зразумела, з перавагаю ўплыву беднаты і батрацтва.

Самакрытыка ў кампаніі перавыбараў саветаў павінна быць разгорнута па лініі недахопаў савецкага апарату, па барацьбе з бюракратызмам, па лініі выяўленьня бюракратычных элемэнтаў, якія маюцца ў нашым апараце.

Мы маем пастанову X і XI з зьезду КП(б)Б аб стварэньні бядняцка-сераднякцкага актыву вакол партыі і саветаў. Гэта задача далёка ня выканана.

Перабудоўваем сельскую гаспадарку.

Узгарнуць будаўніцтва калгасаў і савгасаў, павялічыць засеўны абшар і ўзняць ураджай—наша бліжэйшая задача.

На сацыялістычным шляху.

На нашаму раёну налічваецца калгасаў—4, у якіх аб'яднана 34 бядняцкія сем'і, налічваючых 157 чалавек дарослых і дзяцей. Усе гэтыя калгасы займаюць плошчу зямлі—317 гектараў. Машынных таварыстваў—5, з ліку гаспадарак—68: бядняцкіх—46, серадняцкіх—7; насеных т-ваў—3, ліку гаспадарак—328 і малочная арцель, у якой лічыцца сяброў 265. Акрамя гэтых аб'яднаньняў ёсьць яшчэ розныя дробныя таварыствы, як-та: меліярацыйныя, агнятрывалыя і рыбаводчыя. Усе гэтыя аб'яднаньні ўтварыліся толькі за апошнія два гады.

Вышэй паказаныя калгасы перажываюць перыяд арганізацыйнага афармленьня: земляўпарадкаваньня, скасаваньня ўкоснасьці, пабудовы жыльлёвых будынкаў і інш. Цяжкасьцяў шмат устракаюць калгасаўцы, якім патрэбна штодзённая дапамога па ўсіх галінах. Усё-ж такі, на гледзячы на гэтыя цяжкасьці, калгасы з першага году пачынаюць быць прыкладнымі. Ваколічнае насельніцтва цікавіцца справай зьдзеньня калектыўнай гаспадаркі і дае заявы аб прыняцьці іх у калгасы (пасёлак Гліннае).

Дапамога ўсіх арганізацый павінна быць як з арганізацыйнага боку, а таксама і па падняцьцю культурнага ўзроўню калгасаўцаў. За апошнюю справу ўзяліся прафсаюзы, якія прынялі культшэфства над калгасамі.

Вялікім торманам у разьвіцьці калгасаў і другіх аб'яднаньняў зьяўляецца адсутнічаньне аграномаў і каморнікаў. Апошніх у нашым раёне зусім няма, а агранам толькі адзін.

Ужо ў многіх вёсках беднота імкнецца да арганізацыі калгасаў падтрымоўваемая серадняцкім слоем сялянства. Далейшая наша задача—гэта замацаваньне ўжо існуючых і арганізацыя новых.

Прычым новыя калгасы трэба арганізоўваць больш буйныя і на надзельнай зямлі, бо з маючыхся толькі адзін арганізаваны на надзельнай зямлі.

Крэдытныя таварыствы на сёнешні дзень яшчэ мала зрабілі па абслугоўваньні ўжо існуючых, а таксама па падрыхтоўцы новых калгасаў. Ёсьць нават такія выпадкі, калі крэдытнае таварыства зусім ня ведае аб іх існаваньні ў той час, калі ў гэтай справе можна шмат дапамагчы. Перабудова сельскай гаспадаркі распачалася і сёньня гэтаю думкай жыве большасьць сялянства. Трэба скласьці ўмовы для правядзеньня іх у жыцьцё.

Ан—кі.

Клічаўскі раён, Бабруйшчына.

Увага аграному!

Палепшым працу аграномаў—павялічым ураджай.

У справе павышэньня ўраджайнасьці і культурнасьці сельскае гаспадаркі вялікую і, можна сказаць, галоўную ролю адыгрывае раённы агранам. Ён зьяўляецца фактычным правадніком агрупрапаганды і першым памоцнікам селяніна ў справе наладжваньня агрыкультуры ў сялянскай гаспадарцы. Вось, нагэтаму аграному, у той час, калі ўсур'ёз і безагаворачна ставіцца пытаньне аб неабходнасьці ўзвышэньня ўраджайнасьці, павінна дадзена быць першае слова ў абгаворы гэтага пытаньня.

Мы, на вялікі жаль, у сучасны момант можам канстатаваць, што часта праца нашай раённай аграномніі не дае належных вынікаў, агранамічны персанал у сваёй працы не дасягае свае мэты. Аграработа вядзецца няплянава, нясыстэмна, бязвучотна, наскокам, накіроўваючыся на адшуканьне асобных момантаў высокай ураджайнасьці ў асобных гаспадарках, а не на паступовую перабудову гаспадаркі селяніна на культурны лад.

У чым-жа тут справа, што перашкаджае нам добра наладзіць працу агранаміі, каб мець вынікі гэтай работы? Перашкаджае, папершае, бягучасьць складу нашых агрономаў. Прасачыце за асабовым складам нашых аграномаў у раёнах і вы пабачыце, што за два, тры гады ў кожным амаль што раёне (за малым выключэньнем) пераменілася два-тры агрономы.

Праўда, на гэтую бягучасьць складу аграномаў мае вялікі ўплыў цяга аграномаў да вышэйшай адукацыі, уступленьне на якую патрабуе некаторага кароткатэрміновага практычнага стажу, але факт застаецца фактам. Агранам на вёсцы не зьяўляецца ў нас яшчэ сталым працаўніком у раёне, а калі можна так сказаць, «гастралёрам».

Нельга адхіляць і таго, што гэтаму «гастралёрству» дапамагаюць у значнай меры і нашы замельныя органы, якія таксама часта творацъ пераводы, перакідкі аграномаў і тым зрываюць усю наладжаную агрономам працу, бо, як там ні кажыце, а новы агранам на новым месцы павінен будзе крыху аглядзецца, а потым [illegible] распачынаць справу.

Прычынамі слабай агранамічнай работы аграномаў зьяўляецца яшчэ і тое, што зачастую агрономы скарыстоўваюцца мясцовымі арганізацыямі не па простаму свайму прызначэньню. Трэба абрэзку рабіць—ідзі агранам, выяўляць укрытыя аб'екты—агранам і г. д. Мясцовыя арганізацыі яшчэ ня ўцямілі поўнасьцю таго, што праца агранома на райёне—ёсьць адказнейшая і цяжкая праца і для пасьпяховасьці гэтай працы павінны быць належныя ўмовы.

А хоць-бы возьмем мы агра-асьветную працу агранома. Хіба мала выпадкаў, што з усіх бакоў аграному нясуцца просьбы, прапановы і загады аб тым, што там трэба правесьці курсы, там прачытаць лекцыю, там правесьці гутарку на сельска-гаспадарчую тэму. Праўда, ніхто ня стане гаварыць, што агра-асьвета не патрэбна, але ўсю гэту працу трэба сыстэматызаваць, падначаліць агульнаму пляну, маючаму строга вызначаныя канкрэтныя мэты. Раскідваньне ў гэтай працы толькі торгае аграпрацаўнікоў і належных вынікаў не дае.

Прыходзіцца прызнаць і тое, што частка нашых райённых аграномаў не зьяўляецца добра прыстасаванай да практычнай работы ў райёне, ня гледзячы на тое, што гэтыя агрономы скончылі належныя с.-г. навучальныя ўстановы. Нагэтаму падбору аграномаў, а ў асаблівасьці райённых аграномаў, якія павінны кіраваць усёй агрыкультурнай працай у райёне, пад началам якіх будуць працаваць другія агрономы ў райёне, трэба аддаваць максымум увагі.

А хіба можам мы ад агранома патрабаваць належнай работы, калі нават сродкамі руху на бюджэту райаграномічны персанал кепска забясьпечан.

Усё гэта, разам узятае, стварае перашкоды да пасьпяховае працы нашай агранаміі, а разам з гэтым да падвышэньня прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі, бо агранам-жа першы дапаможнік селяніна ў справе культываваньня яго гаспадаркі. І вось стварэньне належных умоў і наладжваньне якасьці працы нашых аграномаў у першую чаргу павінна стаяць на павестцы сёнешняга дню. Патрэбна паставіць на належную вышыню працу аграномаў і мы зразу будзем мець практычныя вынікі яе ў выглядзе росту ўраджайнасьці нашых палёў і росту вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

д. А. А.

Правадні́кі лепшага жыцьця

(Смалявіцкі раён, Менскае акр.).

У глухім закінутым кутку 30 вёрст ад пэнтру раёна Смалявіч, у Клянініцкім сельсавеце на месцы былога панскага ўладаньня знаходзіцца камсамольскі калектыў, арганізаваны па 35 гектарах у канцы 1926 г. на ініцыятыве двух маладых камсамольцаў Чыкуна і Воўка (цяпер яны ўжо партыйцы).

Сяляне ў першыя часы глядзелі на іх варожа, таму, што аб камсамольцах там раней ніхто ня чуў і ня бачыў, калі сяляне дачуліся, што прыедуць камсамольцы, то лічылі іх за нешта зьўнае.

Але нішто не палохала камсамольцаў і пачатую справу яны давялі да канца.

У арцелі маецца ў сучасны момант 5 камсамольцаў, з іх—адна дзяўчына.

Праца «Камсамольскай Волі» з кожным годам разгортваецца, у гэтым 1928 г. арцель свае экспанаты прадстаўляла на с.-г. выстаўку ў «Дзень Ураджаю» ў м. Смалявічы і за свае экспанаты паляводзтва арцель атрымала самую большую прэмію—саламаварэзку.

Погляд сялян на арцель і камсамольцаў перамяніўся і цяпер сяляне ходзяць да камсамольцаў за парадамі па лепшаму вядзеньню сельскай гаспадаркі, бяруць у арцелі кнігі для чытаньня.

Арцель апрацавала зямлю сялянцы-бяднячкі, таксама абмалаціла дабро двум бядничкам, а таксама засеяла восень жыта бядняцкі.

Камсамольцы-арцельшчыкі ўсе сілы скарыстоўваюць на разгортваньне працы сваёй «Камсамольскай Волі», але малая колькасьць зямлі не дае ім магчымасьці ў належнай меры разгарнуць працу, што неабходна будзе ўлічыць пры правядзеньні земляўпарадкаваньня і дабавіць ім зямлі.

Па ініцыятыве гэтых-жа двух камсамольцаў Чыкуна і Воўка, там, у Пацічове арганізавана ячэйка ЛКСМБ, якая ў сучасны момант налічвае 13 чалавек; ячэйка сваю працу вядзе таксама нядрэнна.

У сувязі з правядзеньнем культпаходу, ячэйка рашыла пабудаваць клюб; як рашылі—так і зрабілі. Другая палова памяшканьня, дзе знаходзіцца школа, была зусім разбурана. Камсамольцы рашылі яе скарыстаць пад клюб. [illegible] у год надпісы лёзт, па якім сабралі 22 руб. На сабраныя грошы закупілі патрэбнага матар'ялу і пошла.

Камсамольцы зрабілі ўжо 7 нядзельнікаў па рамантаваньню памяшканьня пад клюб і ў XI гадавіну Кастрычніка ўрэвалюцыі было адчыненьне клюбу і быў у першы раз у гэтым глухім кутку пастаўлен спэктакль.

Па ініцыятыве ячэйкі арганізаваны лікпункт, які прыступіў да працы з няпісьменнымі. Трэба спадзявацца, што з арганізацыяй клюбу будзе разгорнута і культмасавая праца сярод насельніцтва.

Так расьце і разьвіваецца «Камсамольская Воля», побач з ёй разьвіваецца і наладжваецца праца сярод насельніцтва.

Б. Маркевіч.

На пасёлку жыць ляпей.

(*Расткоўскі с.-с., Ляднянскі р., Аршаншчына*).

У 1926 годзе ў в. Русаны праводзілася земляўпарадкаваньне. Вёска даволі вялікая, і больш сялян—беднякоў. Пры пераходзе тут у большасьці пароблены хутары. Але вось 10 гаспадароў згадзіліся арганізаваць пасёлак.

Сяляліся з іх суседзі, але ня гледзячы на ўсе перашкоды, пасёлкаўцы з кожным годам пачынаюць жыць лепей.

Зусім інакш жывуць цяпер, як жылі раней. На пасёлку куды лягчэй прапаваць.

Вось іхнія дасягненьні за 2 гады. У іх ва пасёлку маецца машыннае таварыства, куды ўступілі гаспадары ўсе як адзін. У пасёлку ёсьць патрэбныя сельска-гаспадарчыя машыны, якіх-бы ніколі адзін гаспадар і ня змог купіць, ня гледзячы на жаданьне. Маецца і тарфянае таварыства, якое выручыла з бяды пасялкоўцаў, бо дроў мала, а торфу даволі.

Агулам кажучы, пасялкоўцы жывуць дружнай сям'ёй. На пасёлку заведзена шматпольле, засяваюць розныя кармовыя травы, канюшыну, віку, турнэпс буракі і інш.

Таксама і выпісваюць пасялкоўцы газэты. На кожны двор—газэта. Па вечарох гаспадары зьбіраюцца, чытаюць кніжкі газэты аб далейшым разьвіцьці сельскае-гаспадаркі. Цяпер не сьмяюцца больш суседзі над пасялкоўцамі, а нават зайздросьцяць ім.

«От і глядзі: з нічога, а пачалі жыць добра»—так часта кажуць сяляне-суседзі.

Ул. Мак—скі.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

(Пасяджэньне 5-га сьнежня г. г.).

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ШОСАЎ, ГРУНТАВЫХ ДАРОГ І АЎТАМАБІЛЬНАГА ТРАНСПАРТУ БССР.

На гэтым пасяджэньні над старшынством т. Галадзеда разам з іншымі былі разгледжаны Палажэньне аб Галоўным Кіраўніцтве Шосаў і грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР і плян вясеньняй пасеўнай кампаніі 1929 г.

Паводле прынятага СНК праекту пастановы арганізуецца новы аб'яднаны Наркамат—Галоўнае Кіраўніцтва Шосаў і грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту утвараецца для кіраваньня гэтымі дарогамі і аўтамабільным транспартам на тэрыторыі рэспублікі. Яно непасрэдна падпарадкавана Савету Народных Камісараў і ў сваёй дзейнасьці праводзіць у жыцьцё дырэктывы Савету Народных Камісараў БССР і Народнага Камісарыяту Шляхоў СССР. Галоўныя функцыі, якія праводзяцца ў жыцьцё гэтым Кіраўніцтвам, наступныя: распрацоўка пытаньняў разьвіцьця дарожнага і аўтамабільнае гаспадаркі рэспублікі, складаньне рэспубліканскіх перспэктыўна-вытворчых плянаў дарожнага будаўніцтва, інструктаваньне мясцовых органаў мосавых і грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту, разпрадзёка кантрольных лічбаў па дарожным будаўніцтве, непасрэднае кіраўніцтва паасобнымі прадпрыёмствамі аўтатранспарту і вырабу дарожнага інвэнтару і г. д.

Паводле пастановы СНК арганізацыя Кіраўніцтва павінна быць скончана да 1-га студзеня 1929 г. Нар. Кам. Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі паводле гэтай-жа пастановы павінна ў трохдзённы тэрмін закончыць працу па вызначэньні структуры гэтага Кіраўніцтва. Праэт пастановы аб органах кіраваньня дарожнаю і аўтамабільнаю справаю і прынятае Саветам Народных Камісараў палажэньне аб іх перадаюцца на зацьверджаньне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР. Адначасова Савет Народных Камісараў пастанавіў прасіць Прэзыдыум ЦВК БССР унесьці на вырашэньне IX-га Усебеларускага Зьезду Саветаў праэкт зьмены адпаведных артыкулаў Канстытуцыі БССР в прычыны арганізацыі новага аб'яднанага Народнага Камісарыяту—Галоўнага Кіраўніцтва Шосаў і грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР.

ПЛЯН ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ 1929 Г.

Па пляну вясеньняй пасеўнай кампаніі Саветам Народных Камісараў быў заслуханы даклад Народнага Камісара Земляробства т. Прышчэпава і саладклад Дзяржаўнай Плянавай Камісіі, якая дала сваё заключэньне на пляну.

Прыняты СНК за аснову плян прадугледжвае праходжаньне вясеньняй пасеўнай кампаніі ў напрамку паглыбленьня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі праз узмацненьне калектывізацыі, вытворчае каапераваньне дробных сельскіх гаспадарак і пашырэньне індустрыяльных прадпрыёмстваў па пераапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі, праз узмацненьне сыроповай базы і наогул сельска-гаспадарчай прадукцыі, праз павялічэньне ўраджайнасьці і пашырэньне пасеўнай плошчы.

У адпаведнасьці з гэтым плян прадугледжвае далейшае ўзмацненьне арганізацыі калектыўных гаспадарак і вытворча-каапэрацыйных аб'яднаньняў, пашырэньне і ўзмацненьне колькасных і якасных мер па павялічэньню ўраджайнасьці, забясьпечаньне насельніцтва сродкамі вытворчасьці, у першую чаргу больш поўнае забясьпечаньне калектыўных гаспадарак і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, пашырэньне кантрактацыі яравых культур, як мерапрыёмства, якое павінна ўзмацніць базу сырцу, пашырэньне тэмпу зернаачышчэньня пасеўнага матар'ялу, як мерапрыёмства найбольш тэннага ў справе падвышэньня ўраджайнасьці, працу на шматпольнаму севазвароту, значны ўрост сельска-гаспадарчага крэдыту і г. д.

Па калектыўных гаспадарках плян прадугледжвае праходжаньне вясеньняй пасеўнай кампаніі ў напрамку далейшага разьвіцьця новых і ўзмацненьня старых калектыўных гаспадарак і пашырэньне іх пасеўнай плошчы і за лік кінутых зямель, якія яшчэ ня ўцягнуты ў сельска-гаспадарчы зварот, так і за лік скарачэньня не занятага пашару, а таксама поўны ахоп усіх культур.

Да пачатку 1927-28 г. у БССР было 440 калектыўных гаспадарак, з якіх у Менскай акрузе—50, у Віцебскай—54, у Аршанскай—76, у Мазырскай—26, у Бабруйскай—53, у Магілеўскай—94, у Гомельскай—37 і ў Полацкай—51. У [illegible] 28 г. было арганізавана 554 калектывы, з якіх у Менскай акрузе—81, у Віцебскай—63, у Аршанскай—102, у Мазырскай—31, у Бабруйскай—55, у Магілеўскай—124, у Гомельскай—59 і ў Полацкай—39.

Паводле пляну НКЗему на 1928-29 г. мяркуецца арганізаваць яшчэ 360 калектыўных гаспадарак на плошчы 51.800 гэк., з якіх 30 буйных, на 200—500 гэкт. ў Бабруйскай акрузе—5 буйных савецкіх гаспадарак будуць арганізаваны на асушаных землях калёнізацыйнага фонду.

Далей плян прадугледжвае пашырэньне сеткі машынных, меліярацыйных т-ваў паляпшаньне арганізацыйна-вытворчага абслугоўваньня іх. Так, павінны быць арганізаваны ў 1928-29 г. 322 машынных і 128 меліярацыйных т-ваў. Плян прадугледжвае натрабную колькасьць насеньня, прыладаў, машын, угнаеньня, арганізацыю майстэрняў для дробнага рамонту сельска-гаспадарчых прыладаў і машын, сартыроўку і ачыстку насеньня, пратручваньне насеньня, культурную і агрыкультурную працу калектыўных гаспадарак.

Для канчатковай рэдакцыі пастановы Савету Народных Камісараў па гэтым пытаньні выбрана адпаведная камісія. Пастанова гэта будзе разглядацца на наступным пасяджэньні Савету Народных Камісараў.

III ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Савет Народных Камісараў вызначыў Клімавіцкі раён, Магілеўскай акругі месцам для III тыражу пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі.

АСЛАБАНЕНЬНЕ ТАВ. АДАМАЙЦІСА ДА АБАВЯЗКАЎ НАРОДНАГА КАМІСАРА ГАНДЛЮ.

У зьвязку з пераходам тав. Адамайціса на сталую працу ў Маскву СНК пастанавіў аслабяніць яго ад абавязкаў Народнага Камісара Гандлю БССР. Пастанову гэту СНК падаў на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК.

КУЛЬТУРНЫ ПАХОД У ВЁСКУ.

«За падвышэньне ўраджайнасьці»! Гэты лёзунг павінен стаць лёзунгам кожнага грамадзкага працаўніка. Асабліва гэта павінна датычыцца зямельных працаўнікоў, якія непасрэдна зьвязаны з сельска-гаспадарчаю вытворчасьцю. Бязумоўна, у першай лініі тут павінен стаяць агранам, як перабудоўчык нашае сучаснае сельскае гаспадаркі.

Зараз мы маем такое становішча: рабоча-сялянская ўлада аддае сельскай гаспадарцы значную ўвагу. Будуюцца вышэйшыя, сярэднія і ніжэйшыя сельска-гаспадарчыя школы, якія накіроўваюць у гушчы сялянства агранамічныя сілы. Будуюцца дасьледчыя ўстановы і станцыі розных відаў, якія ставяць досьледы на адпаведныя тэмы і атрымліваюць дужа каштоўныя і неабходныя для сельскай гаспадаркі вынікі. Будуюцца заводы, якія выпрацоўваюць штучнае ўгнаеньне і выробляюць сельска-гаспадарчыя машыны. Разводзіцца і распаўсюджваецца сярод сялянства палепшанае насеньне і г. д., і г. д. А ўраджайнасьць або стаіць на месцы, або павышаецца вельмі мала.

Між тым у нашых заходніх суседзяў, напрыклад, у Нямеччыне, нагул з такімі-ж глебамі і кліматам, ураджаі з такіх-жа плошчаў атрымліваюцца ў 4-5 разоў большыя, як у нас.

З працы нашых дасьледчых устаноў відаць, што пры належным падыходзе да зямлі вынікі атрымліваюцца пажаданыя; ураджаі бываюць ня меншыя, як і ў нашых замежных суседзяў. Дык у чым жа справа? Дзе-ж тут галоўная прычына? Няўжо-ж селянін ня хоча атрымаць высокага ўраджаю? А справа, мне здаецца, у матадах працы нашае агранаміі.

Вядома, што для селяніна патрэбен сказ і паказ. І асабліва для яго пераконваючым зьяўляецца паказ.

Селянін, убачыўшы дасягненьні ад агранамічнай навукі, зьмяняе свае «дзедскія» метады на тыя, якія ўжываюцца агранаміяй. І гэта зусім зразумела.

У чытача можа паўстаць пытаньне: дык хіба-ж нашы агрономы не працуюць?

Яны працуюць, можа, нават надта многа; апроч таго, працуюць у дужа цяжкіх умовах. Зараз Наркамзем ужыў самыя рашучыя меры для палягчэньня ўмоў працы агранаміі на мясцох. Але гэтую працу я-б ахарактарызаваў, перабудаваўшы расейскую прыказку так: «Агрономы пачытваюць, а сяляне пазёўваюць», а пасьля гэтых «прыемных» заняткаў кожны пашоў сваёю дарогаю: агранам сабе з задаваленьнем, што поўную колькасьць «процантаў» па пляну змахнуў, а селянін сабе, пабыўшы на сходзе, як-бы адбыўшы грамадзкі абавязак і будучы ўпэўненым, што ён ужо сваю чаргу адбыў.

Ударнаю работаю лічыцца работа па пераводу сялянскіх гаспадарак на шматпольле. У гэтай галіне таксама часта выганяюцца «процанты», уводзячы шматпольле ў тых гаспадарках, якія маглі-б быць пераведзенымі ў апошнюю чаргу, гэта значыць, многазямельных гаспадарках, багатых.

У гэтым уся наша трагедыя! А фактычна агранам зьяўляецца галоўнейшым суставам, які злучае ўсе мерапрыёмствы ўлады ў галіне палепшаньня сельскае гаспадаркі, дасягненьні навукі і тэхнікі, накіраваныя ў сельскую гаспадарку. Гэта—апошнія шчупальцы плянуючых арганізацый, якія павінны ўсё дакладна ўпарадкаваць у сельскай гаспадарцы, што накіроўваецца з другіх галін народнае гаспадаркі. Гэта ключар як сялянскага, так і народна-гаспадарчага сьвірнаў.

А калі гэта ключар, дык трэба, каб гэты ключар карыстаўся давер'ем уласьнікаў сьвірнаў.

Гэтае давер'е можна, водлуг маёй думкі, атрымаць, рэарганізаваўшы працу агранома.

Найперш за ўсё зьяўляецца бязумоўна неабходным замацаваць агранома на адным месцы, бо толькі тады агранам можа быць карысным на ўсе сто процантаў для райёну і наогул для справы, калі ён вывучыць як сьлед свой райён як з боку экзанамічнага, так і прыроднага. Гэта патрабуе часу ня менш аднаго году.

Самая пабудова працы ўяўляецца наступным чынам:

Зараз-жа ў кожным агранамічным райёне арганізаваць курсы для сялян па агранамічных ведах, згодна напрамкаў разьвіцьця гаспадаркі райёну.

На курсах павінны выкладацца веды па рэарганізацыі гаспадаркі райёнаў з паказаньнем патрэбнага севазвароту, расьлін у севазвароце, спосабаў апрацоўкі глебы пад гэтыя расьліны, найлепшыя сельска-гаспадарчыя машыны і прылады для гэтай апрацоўкі, найлепшае насеньне, угнаеньне, дзе ўсё гэта можна атрымаць, збыт прадукцыі, неабходнасьць калектыўнай гаспадаркі ў мэтах выгаднага гаспадараньня. На аснове аграрнага пытаньня павінна быць растлумачана аграрная палітыка савецкай улады.

Колькасьць слухачоў трэба паставіць у залежнасьць ад мясцовых магчымасьцяў. Тэрмін курсаў—да 3-4 месяцаў.

Набор на курсы рабіць з мясцовага камсамолу і серадняцкага і бядняцкага элементу, вясковага актыву, якім зьяўляюцца чырвонаармейцы, у значнай меры пазбаўленыя тэй коснасьці, якая трымае ў кіпцюрох нашу вёску.

Курсы арганізоўвае райённая агранамія пад кіраўніцтвам райённага агранома.

Па сканчэньні курсаў праца не павінна канчацца, як звычайна бывае, а самае для нас важнае павінна пачацца. Кожны курсант бярэ сабе тэму, або некалькі тэм для пастаноўкі, і гэтыя досьледы робіць на сваім полі. Кожнага з гэтых курсантаў агранам не павінен спускаць з вачэй, як і кожнага мерапрыёмства, праведзенага ў гаспадарцы курсанта. Кожнае дасягненьне або няўдача павінны дэманстравацца тут-жа на месцы, сярод насельніцтва, растлумачваючы прычыну вынікаў.

Гэтыя кадры гаспадароў-дасьледчыкаў, дапаўняемыя ў кожны надыходзячы для гэтага час, павінны заставацца ў такім стане сталымі.

Мая думка, што толькі пасьля гэткага засеву можна чакаць станоўчага і пажаданага ўраджаю.

П. Каднавец.

Батрацкі калгас мацнее.

Абрыдала бігосаўскім батракам цяжкае батрацкае жыцьцё, захацелася пазбавіцца залежнасьці ад гаспадароў кулакоў.

Доўга гутарылі паміж сабой, шукалі шлях да новага, сапраўднага жыцьця. На дапамогу прышла савецкая ўлада і выхад быў знойдзен.

У 1923 г. 20 батракоў арганізавалі ў маёнтку „Новікі» калгас. Пасьля да батракоў далучылася беднота і зараз у калгасе ўжо 11 сем'яў з лікам 54 чалавек.

У першы час заможнікі сьмяяліся з батракоў:

— Што можа быць з гультаёў. Вось чакайце, хутка разьбягуцца.

Хутка гаспадарчы рост калгасу перакінуў усякі сьмех. Твары заможнікаў сталі сур'ёзны і пад час злыя.

Да 1927 г. сябры калгасу ўладалі сваёй маемасьцю кожны паасобку. Потым зразумелі, што гэта нядобра і аб'яднялі ўсё ў агульнае, калектыўнае.

Калгасьнікі за 2000 руб. адрамантавалі разбураныя панскія будынкі, як для сябе, так і для жывёлы. Зараз кожная сям'я калгасу мае па два добрых пакоі, дзе назіраецца імкненьне да чыстаты і апратнасьці.

Патрацілі больш 5500 р., калгас набыў шэраг с.-гаспадарчых машын: 2 малатарні, 2 веялкі, 1 сартыроўку, 1 жнярку і інш.

— Шмат сродкаў мы патрацілі на агракультуру, але на добрую справу пашкода,—гаворацъ калгасцы.

Культурацу калгасьнікі лічаць сур'ёзнай і неабходнай справай у сваім жыцьці.

У ленінскім кутку штодзённа зьбіраецца калектыўная сям'я, дзе абмяркоўваюцца розныя гутаркі, даклады і г. д.

— Даволі цемры, даеш сьвет, —кажуць калгасьнікі,—бяз культуры добрага жыцьця не набыць. Ёсьць пры калгасе камсамольская ячэйка, кандыдацкая партгрупа. Добра працуе делегацкі сход.

Хаця і маюцца яшчэ недахопы ў калгасе, як, напрыклад, слабая ўраджайнасьць (пшаніца 100-102 п., жыта 60-62 п. з гэкт.) але калгасьнікі ня вешаюць галаву, яны поўны ўверанасьці ў будучае.

— Будзе ўсяму свой час, усё наладзім.

Калгас дапамагае ваколічным сялянам машынамі, насеньнем, культурацай.

— Гэта наш абавязак,—з гонарам кажуць сябры калгасу.

Вось гэтак жыве і мацнее батрацкая гаспадарка—„Верны шлях», якая хутка стала добрым прыкладам сялянству.

Мін. С.

Бігосаўскі с.-с., Дрысенскага р-ну, Полаччына.

Сялянскія газэты ў справе ўзьняцьця ураджайнасьці.

Тры задачы на бліжэйшы час намячаюць партыя і савецкі ўрад у справе дальнейшага разьвіцьця сельскае гаспадаркі:—рашучае і бязупынное разгортваньне калгаснага і савгаснага будаўніцтва, пашырэньне засеўных абшараў і неадкладнае ўзьняцьце ўраджайнасьці бядняцкіх і серадняцкіх палёў.

Два апошнія пытаньні, побач з першай задачай, набываюць у сучасны момант асабліва важнае значэньне, не таму, што мы маем «застой» ці дэградацыю ў справе павялічэньня валавай сельска-гаспадарчай прадукцыі, а таму, што далейшае разгортваньне індустрыялізацыі савецкае краіны патрабуе яшчэ большага, чым ёсьць, павялічэньня сыравіны, якую можа і павінна даць сельская гаспадарка.

Канкрэтна ў бліжэйшы год ставіцца задача пашырэньня засеўнае плошчы, на ўсяму Саюзу на 7 процантаў і ўзьняцьця ўраджайнасьці на 3 процанты—ў адносінах да нашага сучаснага становішча. А ў бягучую пяцігодку нашага гаспадарчага будаўніцтва ўраджай павінен павялічыцца мінімум на 30—35 процантаў.

Гэтае пытаньне не зьяўляецца вузка нарканземаўскім пытаньнем. Таму мы і бачым, што за апошні час, асабліва пасьля XV зьезду УсеКП(б), уся савецкая грамадзкасьць зьвяртае ўсё больш і больш увагі на справу палепшаньня сельскае гаспадаркі наогул і ўзьняцьця ўраджайнасьці—ў прыватнасьці.

Пазіўнасьць такога становішча і дае нам права загаварыць аб тым, ці ўсе на гэтым фронце добра, ці сапраўды ўжо мы ўсе сілы аддалі па гэты важны вучастак нашага фронту.

Нам ня прыдзецца падрабязна спыняцца на тэй адказнай ролі, якую адыгрываюць у гэтай справе нашы сялянскія цэнтральныя і сялянскія акруговыя газэты. Роля іх у справе прапаганды за добры ураджай відавочна.

Але ці ўсё імі зроблена ў гэтым напрамку?

Перад намі камплект газэты, «Чырвоная Полаччына» за год Што зроблена памянёнай газэтай у справе прапаганды да ўзьняцьця ўраджайнасьці полацкіх палёў?

Газэта сялянская, і патрабаваць ад яе асьвятленьня пытаньняў, зьвязаных з сельскаю гаспадаркаю, мы маем права. Але ня будзем рабіць пасьпяховых вываваў. Будзем гаварыць канкрэтна.

Газэта час ад часу хоць і пад узорным, але глухім і сухім загалоўкам —сельская гаспадарка, а дарэчы, такіх «казённых» нічога ня кажучых загалоўкаў у гэтай газэце шмат («Спажывецкая каапэрацыя», «Куток рабселькора», «Партыйнае жыцьцё», «Аб працы РСІ». „Пазыка ўзмацненьня сельскае гаспадаркі» і г. д.). Дык вось пад маленькім загалоўкам у дзьве калёнкі даюцца адна, дзьве заметкі такога зьместу: „як трэба даіць карову" і „торф як апал", праз тыдзень —„як лячыць скаціну ад карасты", далей—„як даглядаць за цялём і жарабём", „Як адучыць ад нядобрых прывычак каня і карову", і на гэтым справа спынілася болей, як на месяц. Пытаньні ня дрэнныя.

Патроху асьвятляецца ход пасеўнай вясеньняй кампаніі. Вынікі апошняй не падводзяцца. Праходзіць у сяхітакіх заметачках лета, і, нарэшце, 8 жніўня маленечкай заметкай адкрываецца кампанія падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Зноў маўчаньне пра сяўбу да 5-га верасьня. Яшчэ дзьве заметкі, і справа на гэтым скончана.

Як бачыць чытач, асеньнюю пасяўную кампанію „Чырвоная Полаччына" праспала. «Спалі, як пшаніцу прадаўшы»: ні аб своечасовым разгортваньні, ні аб штуршкох, ні аб выніках—ні слова.

Далей—«Дзень Ураджаю». На такое ўрачыстае сьвята адгукнуліся некалькімі павархоўнымі артыкульчыкамі і гэтым нібы адбылі свой абавязак.

Што-ж давала Полацкая газэта селяніну?

Рэзалюцыі.

Бачыце, за год у «Чырвонай Полаччыне» было зьмешчана звыш 20-ці розная зьместу рэзалюцый, у той час, як сельска-гаспадарчых куткоў было ўсяго 10. У 86 нумарох газэты толькі дзесяць раз зьвярталіся працаўнікі рэдакцыі з больш-менш карыснымі і практычнымі прапановамі да селяніна —свайго чытача, аб узьняцьці і палепшэньні сельскае гаспадаркі. А рэзалюцыі выраставалі да 200 і 300 радкоў! І бывала, што адна рэзалюцыя працягам друкавалася ў другім нумары газэты. Сельска - гаспадарчыя куткі зьмяшчаліся зусім не на відным месцы газэты, займаючы меленечкі ражок, і выглядалі, як адзінокі бяспрытульны на рагу вуліцы.

„Чырвоная Полаччына", напрыклад, перадрукоўвае з цэнтральных газэт і дае свайму чытачу на разгляд артыкул тав. Дылы, аб тэматычным пляне Белдзяржкіно. Мы ня хочам сказаць, што селянін не павінен азнаёміцца з такім пытаньнем, але трэба яго належным чынам падпесьці чытачу. Нельга-ж у сялянскай газэце даваць у 200 радкоў артыкул, які прадугледжваў іншага, болей кваліфікаванага чытача. Працаўнікі рэдакцыі проста не захацелі падаць гэтаму артыкулу больш чытальную для селяніна форму, і далі ўвесь артыкул, абы толькі запоўніць газэту.

Сымптэматычным зьяўляецца і тое, што ў „Чырвонай Полаччыне" друкуецца артыкул у 280 радкоў „аб выніках агітпрапаганды на акрузе" і ні радочка няма аб агрупрапагандзе, менавіта аб агрупрапагандзе, бо па даному пытаньню шмат ужо зроблена агітацыйных выступленьняў.

Словы, сказаныя тав. Сталіным на лістападаўскім пленуме ЦК УсеКП(б) што—„Трэба кінуць агульныя сказы і балбатню аб сельскай гаспадарцы наогул і перайсьці, нарэшце, да распрацоўкі практычных мерапрыёмстваў дзеля узьняцьця збожжавае гаспадаркі адпаведна з рознымі ўмовамі ў розных раёнах,—менавіта, падыходзіць да нашае сялянскае газэткі.

Як дагэтуль «Чырвоная Полаччына» давала куток «Сельская гаспадарка»?

Несыстэматычна, урыўкамі, час ад часу. Газэта выкарыстоўвала амальшто толькі артыкулы, дасылаемыя «прэс-клішэ». Ня было створана належнай думкі ўсяе грамадзкасьці Полаччыны да гэтае справы. Ня прыцягваліся мясцовыя агранамічныя сілы, не выкарыстоўваліся вопыты сялянадасьледчыкаў і іншых сялян, якія вядуць сваю гаспадарку больш культурна.

Напрыклад, у «Савецкай Беларусі» ў адной з старонак «За ўзьняцьце ўраджаю» («С. Б.» № 240, 17 кастрычніка г. г.) апісвалася аб дасягненьнях калгасу „Поўны Шлях", дзе дзесяціна ўжо дае 110 пуд. пшаніцы; апісвалася таксама ў другім артыкуле, што на асушаным балоце ўраджай жыта дасягнуў 120 пуд., аўса—124 пуд., вікі з аўсом—157 пуд. Карняплодаў на асушаным балоце зьбіраецца 2200 пудоў, бульбы—700 пуд. і капусты—2000 пуд.

Гэта з адной дзесяціны, з тэй самай дзесяціны, з якой звычайна полацкі селянін атрымлівае ўраджай удвое і ўтрое меншы.

Чаму ў полацкай газэце на гэтых блізкіх селяніну факт

РЭЗАЛЮЦЫЯ,

ПРЫНЯТАЯ ПРАЎЛЕНЬНЕМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ НА ПАСЯДЖЭНЬНІ 5-га СЬНЕЖНЯ 1928 ГОДУ АБ ЛІСЬЦЕ ТРОХ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ У ГАЗЭЦЕ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" — АД 4 га СЬНЕЖНЯ Г. Г.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, зачытаўшы ліст 3-х беларускіх пісьменьнікаў, студэнтаў Б.Д.У. —Зарэцкага, Дудара і Александровіча, надрукаваны ў № 278 газэты „Савецкая Беларусь", канстатуе, што факты, на якія яны спасылаюцца ў сваім лісьце, не адпавядаюць сапраўднасьці. Беларускія пісьменьнікі, як і іншыя студэнты, маюць поўную магчымасьць працаваць у Б. Д. У. Уся навучальная і выхаваўчая сыстэма стварае для гэтага спрыяючыя ўмовы. У навучальных плянах Пэдагагічнага факультэту шмат увагі адведзена беларускай і іншай літаратуры, якая павінна прадстаўляць непасрэдны і бліжэйшы прадмет вывучэньня пісьменьнікаў.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту лічыць неабходным падкрэсьліць, што тэмп беларусізацыі з кожным годам узмацняецца, што павялічваецца колькасьць дысцыплін, якія пераводзяцца на беларускую мову, і што пашыраецца кадр беларускіх навуковых працаўнікоў.

Студэнцкая маса ўцэлым адносіцца вельмі спрыяюча да беларусізацыі Унівэрсытэту, і калі ёсьць некаторыя паасобныя студэнты, якія адносяцца няпрыхільна да беларусізацыі, то гэта ніколькі не зьмяняе фізыяноміі Унівэрсытэту, як беларускай установы. З гэтай прычыны Праўленьне БДУ разглядае выпады 3-х асоб супроць Унівэрсытэту як хлусьню і паклёп, якія ні ў якай меры не адпавядаюць рэчаістасьці.

Рэзалюцыя

АГУЛЬНАГА СХОДУ СТУДЭНТАЎ МЭДФАКУ.

Заслухаўшы інфармацыю і азнаёміўшыся з лістом беларускіх пісьменьнікаў зьмешчаным у газэце „Савецкая Беларусь" ад 4-га сьнежня г. г. за № 278 за подпісам пісьменьнікаў Александровіча, Дудара і Зарэцкага, агульны сход студэнтаў Мэдфаку які адбыўся 5-га сьнежня г. г., з абурэньнем асуджае ўчынак, які выразіўся ў хлусьні і паклёпе на пралетарскае студэнцтва і і кіруючы склад БДУ, нібы ў яго мурох няма ўмоў для заняткаў беларускім пісьменьнікам, у выніку чаго яны як быццам прымушаны пакінуць апошні.

Сход студэнтаў Мэдфаку заяўляе што Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт на працягу сямі гадоў свайго існаваньня пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі зьяўляецца асяродкам беларускае культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу і ідзе па шляху нацыянальнага ўзросту і замацаваньня.

Адзначаючы некаторую памылку насьценгазеты «Кузьня Асьветы» ў вымяшчэньні без належнай заўвагі рэдакцыі артыкулу «Фрагменты з жыцьця 2 курсу літаратурнага аддзяленьня», які абвінавачвае ўсіх пісьменьнікаў у некаторых хворых зьявішчах, а таксама, што памылка была выпраўлена ў другім нумары газэты, сход заяўляе, што ўсё гэта не давала ніякае падставы для абліваньня гразьзю пралетарскага студэнцтва і аднаго з цэнтраў беларускай культуры—Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт.

Сход студэнтаў Мэдфаку разглядае гэты ліст, як вынік даўленьня дробнабуржуазнай стыхіі на пралетарскае студэнцтва і заклікае апошнае весьці рашучую барацьбу з няправільнымі ўхіламі і хворымі настроямі сярод студэнцтва.

Адзначаючы значныя дасягненьні ў беларусізацыі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, і ў прыватнасьці Мэдфаку—сход пераконан у тым, што ніякая хлусьня ня можа заплямліць дэмагагічнымі выпадамі Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, адкуль-бы яны ні паходзілі.

Старшыня сходу мэдфаку
ВІГДАРОВІЧ.

Рэзалюцыя

АГУЛЬНАГА СХОДУ СТУДЭНТАЎ ПРАВГАСУ

Заслухаўшы інфармацыю тав. Капаніна аб зьмешчаным у № 278 газ. «Сав. Бел.» адкрытым лісьце пісьменьнікаў-студэнтаў —Зарэцкага, Александровіча і Дудара і абгаварыўшы яго, агульны сход студэнцтва Правгасу разам з часткаю прафэсуры і навуковых працаўнікоў з вялікім абурэньнем адхіляе беспадстаўнасьць і дэмагагічны паклёп з боку аўтараў лісту на пралетарскае студэнцтва, Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт і яго кіруючыя органы.

Агульны сход адзначае, што за апошнія гады Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт мае значныя дасягненьні ў справе беларусізацыі і карэнізацыі Унівэрсытэту, і што ў мурох яго ёсьць усе спрыяючыя ўмовы для поўнага разьвіцьця нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу культуры,

Агульны сход заяўляе, што, ня глядзячы на ўпадзіцкія дробна-буржуазныя і шавіністычныя настроі аўтараў лісту і паасобных студэнтаў, Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, як кузьня беларускае пралетарскае культуры, пад кіраўніцтвам яго партыйных і кіруючых органаў, і надалей будзе пашыраца і выконваць задачы, пастаўленыя перад ім партыяй і савецкай грамадзкасьцю, прыцягваючы ў свае сьцены лепшую частку пралетарскай моладзі Заходняй Беларусі.

Агульны сход Правгасу ўпэўнен у тым, што аўтары лісту—Зарэцкі, Александровіч і Дудар ні ў якой ступені не адпавядаюць думкі і настроў беларускіх пісьменьнікаў, якія безадкладна адмяжуюцца ад выступленьня аўтараў лісту.

Сход заклікае ўсё пралетарскае студэнцтва пратэставаць проці бязгрунтоўнай хлусьні, накіраванай проці Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і яго кіруючых органаў.

Прэзыдыум сходу—
ШУСТЭРМАН, ЭПШТЭЙН,
КУЗЬНЯЦОЎ.

ЗА ВЫКАНАНЬНЕ КАНТРАКТАЎ.

ДА АСОБ, ЯКІЯ НЕ ЗДАЮЦЬ ЗАКАНТРАКТАВАНЫХ КУЛЬТУР, УЖЫВАЮЦЦА РАШУЧЫЯ МЕРЫ.

Першы тэрмін здачы закантрактаванага насеньня па Менскай акрузе скончыўся 1 лістапада.

Да гэтага тэрміну павінна было паступіць палавіна закантрактаванай бульбы і льнянога насеньня і 30 проц. ячменю насеннага і на тэхнічныя патрэбы.

Фактычна-ж паступіла: бульбы—48 пр., льнянога насеньня—26,3 проц., тэхнічнага ячменю—17 процантаў і насеннага—нічога.

Такім чынам месяц настрычнік даў надзвычайна дрэнныя вынікі па збору закантрактаваных культур.

Лепшае месца ў справе збору займаюць раёны Капыльскі, Пухавіцкі, Сьмілавіцкі, якія выканалі кантракты амаль поўнасьцю і Астрашыцка-Гарадзецкі, які першую рату ўзносу па закантрактаванаму ільно-насеньню выканаў на 100 проц.

Заслаўсні, Самахвалаўсні, Лагойскі і Бярэзінскі раёны здачы закантрактаваных у весьненюю пасеўную кампанію культур яшчэ не распачыналі.

Дзьве дзесяцідзёнкі ў лістападзе далі па збору наступныя вынікі: бульба—50 проц., ільно-насеньне—50 проц., ячмень тэхнічны—40 проц. і ячмень насенны—40 пр.

Параўнаўшы здачу культур за кастрычнік з 2-ю дэкадаю лістапада ўбачым, што ў справе здачы закантрактаваных культур наступіў некаторы пералом у лепшы бок. Тэмп здачы значна павялічыўся і дзьве дэкады лістападу далі больш, чым увесь кастрычнік.

Сэрадэлі павінна было паступіць да 1 сьнежня 867 цэнтнераў. Пакуль што, на 20 лістапада, здадзена толькі 42 цэнтнэры, ці 5 проц.

Вось прычыны, якія затрымліваюць здачу закантрактаваных культур—зацяжная і дажджлівая восень, якая перашкаджала і збору і абмалоту ўраджаю; таварыствы сельска-гаспадарчага крэдыту былі перагружаны працаю па загатоўках, па крэдытаваньню і зьбіраньню паявых капіталаў.

Зразумела, гэтыя прычыны яшчэ не прычыны, яны не маглі аказаць такога рашучага ўплыву на збор закантрактаваных культур. Былі прычыны больш канкрэтнага характару, як напрыклад, няпрыняцьце рашучых мер да кантрактантаў.

Такое становішча ў паступленьні закантрактаваных культур прэзыдыум Менскага АВК прызнаў надзвычайна дрэнным і пагражаючым у справе кантрактацыі.

У сувязі з гэтым, прэзыдыум АВК пастанавіў:

Адпаведным установам ужыць да кантрактантаў самыя рашучыя меры. Райвыканкомам высьветліць прычыны дрэннай здачы і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Праўленьні сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў папярэдзіць, што ў выпадку няпрыняцьця мер да здачы закантрактаваных культур вінаватыя будуць прыцягнены да суровай адказнасьці.

С. Азерові.

Жанчына ў саматужных арцелях.

У апошні час назіраецца моцная цяга жанчын-саматужніц у арцелі. Па Беларусі мы ўжо маем 1449 жанчын працуючых у розных арцелях, што складае 15 проц. усіх каапераваных мужчын.

На прамысловасьці жанчыны разьмяркоўваюцца наступным чынам:

У швэйнай прамысловасьці 357 жанчын, у панчошна-трыкатажнай—331, у ткацкай прамысловасьці—436, у харчовай—184, у дрэваапрацовачнай—93, шаўцоў і загатоўшчыкаў—4, у смалярнях—4, гарбарнях—5, у іншых галінах—35.

Усё-ж процант жанчын-саматужніц проці мужчын саматужнікаў адстае.

Тлумачыцца гэта тым, што большасьць саматужніц працуе ў такіх арцелях, дзе недахват сыравіны. Мае значэньне таксама нізкая кваліфікацыя і бытавыя ўмовы.

У апошні час праводзіцца вялікая праца па арганізацыі жаночых арцеляў сярод вясковай беднаты. Там арганізуюцца ткацкія арцелі, вырабы якіх пойдуць на экспарт.

Шэраг арцеляў (швэйная, трыкатажная) механізуюцца. Уводзіцца падзяленьне працы, што адаб'ецца на паталеньні прадукцыі.

Заработак жанчын у арцелі хістаецца ад 33 да 100 руб. у месяц.

Культурны ўзровень жанчыны яшчэ нізкі, асабліва гэта адчуваецца ў мястэчку і ў вёсцы.

Забясьпечваць жаночыя арцелі дастатковаю колькасьцю сыравіны, узьняць культурны ўзровень жанчын-саматужніц—гэта задача сёнешняга дня.

С. Эвэнчык.

Пабудова рабочага пасёлку на заводзе „Ільліч".

Прэзыдыум Дзяржплану БССР на сваім апошнім пасяджэньні разгледзеў пытаньне аб пабудове рабочага пасёлку пры шкляным заводзе „Ільліч" у Быхаве, Магілёўскай акрузе. Прэзыдыум Дзяржплану пастанавіў весьці будаўніцтва пасёлку в такім разьлікам, каб скончыць яго на працягу 2-х год. Агульны кошт пабудовы пасёлку вызначан у 400000 руб. Гэтае пытаньне перададзена на канчатковае зацьверджаньне ў СНК БССР.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

Разьмяркаваньне фонду мэханічнага падвышэньня зарплаты.

Па лініі ВСНГ Беларусі адпушчана 297.000 руб. на мэханічнае падвышэньне зарплаты аддалым групам рабочых. Прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў разьмяркаваньне гэтага фонду па асобных галінах прамысловасьці. Больш буйныя сумы адпушчаны лёнапрадзільнай прамысловасьці 60.000 руб., сярнікоўай—80.000 руб., шкляной—45000 руб., дрэваапрацовачнай—35000 руб., харчовай—25000 руб. і г. д.

Арганізацыя курсаў па ахове працы.

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ дырэктар інстытуту аховы працы тав. Дзяхцар паставіў пытаньне аб неабходнасьці арганізаваць курсы для падрыхтоўкі працаўнікоў па ахове працы і тэхніцы бясьпекі. Праграма курсаў разьлічана на 2 тыдні па 3 гадзіны заняткаў штодзень. На курсы будуць высланы старшыні камісій па ахове працы фабзавмясцкомаў і працаўнікі, якія адказваюць за тэхніку бясьпекі на прадпрыёмствах.

Прэзыдыум ЦСПСБ лічыць мэтазгодным арганізаваць такія курсы ў больш буйных гарадох і ў першую чаргу ў Менску, Віцебску і Гомелі. Пастаноўлена прасіць ВСНГБ аб водпуску сродкаў на ўтрыманьне курсаў.

На барацьбу з алкагалізмам.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў арганізаваць часовы ўсебеларускі савет па барацьбе з алкагалізмам у складзе 31 чал. Савет будзе складзены з прадстаўнікоў партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і іншых грамадзкіх арганізацый. У савет увойдуць таксама прадстаўнікі больш буйных фабрык і заводаў Менску і навуковыя працаўнікі. Культаддзелу ЦСПСБ даручана ў бліжэйшым часе склікаць савет і абгаварыць пытаньні аб практычнай працы савету па барацьбе з алкагалізмам у БССР.

Аб становішчы полацкага камбінату.

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў інфармацыю аб становішчы полацкага камбінату і пастанавіў лічыць недапусцімым як з боку полацкага акрыпрафбюро, так і ЦП саюзу дрэваапрацовачнікаў повыю інфармацыю прэзыдыуму ЦСПСБ аб цяжкім становішчы і затыканьні камбінату. Побач з гэтым запрапанавана Полацкаму АПБ безадкладна паставіць перад адпаведнымі арганізацыямі пытаньне аб разьмеркаваньні рабочай сілы камбінату па другіх прадпрыёмствах Полацку. Пастаноўлена падтрымаць хадайчаньне ЦП саюзу дрэваапрацовачнікаў перад ВСНГБ і Лесбелам аб перадачы заводу былога камбінату пад кіраўніцтва Лесбелу.

Калдагаворная кампанія ў саюзе сельгаслесрабочых.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў стары калдагавор прадоўжыць да 1 сакавіка 1929 г. і запрапанаваў ЦП саюзу сельгаслесрабочых паставіць на абгаварэньне рабочых мас аб прапягненьні моцы старога калдагавору і аб прычынах яго працягненьня.

За начульныя адносіны да патрэб рабочых.

Прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў інфармацыю аб становішчы заключэньня новага калдагавору на пачатковай фабрыцы і пастанавіў паставіць на від прэзыдыуму ЦП саюзу скурнікаў за начульныя адносіны да патрэб рабочых і за запазыданьне заключэньня новага калектыўнага дагавору. Разам з тым прэзыдыум ЦСПСБ указвае на недапушчальнасьць зацягваньня заключэньня новага калдагавору кіраўніцтвам працкалектываў. Пастаноўлена прасіць НК Працы даць адпаведны загад кіраўніцтву працкалектывамі аб своечасовым заключэньні калдагавору.

Да 10-годзьдзя БССР.

Таварыства «Прыхільнікаў дзяцей» Менскай акругі да 10-хгодзь дзя агалашэньня БССР адчыняе для бяспрытульных дзяцей панчошную і швэйную майстэрню. Майстэрня разьлічваецца на 100 дзяцей. Апрача таго дзіцячы ачаг па Суражскай вуліцы пашыраецца і будзе абслугоўваць 50 дзяцей бяспрытульных і дзяцей матак адзіночак.

Да сьвята дзецям беднаты будзе выдавацца абутак, вопратка і іншыя рэчы. У сталовай для бяспрытульных і дзіцячых ачагоў будуць праводзіцца сходы матак. На сходах будуць ставіцца даклады аб 10-цігодзьдзі БССР.

* * *

Адбылося пасяджэньне Менскай акружнай камісіі па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССРа Пасяджэньне пастанавіла да часу сьвята выдаць 27 розных адкрытак.

Тав. Рабінавічу даручана намеціць тыя прадпрыёмствы, якім будзе дадзена назва імя 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР. Для ўдзелу ў сьвяткаваньні пастаноўлена запрасіць рабочыя дэлегацыі з Ленінграду, Масквы, Харкаву, Тыфлісу, Бабруйску, Гомелю і Барысаву.

У час сьвята адбудзецца выезд шэфаў у падшэфныя вёскі.

Белмузтэхнікум на шляху да рэарганізацыі ў кансэрваторыю.

Савнарком БССР зацьвердзіў арганізацыю дадатковай клясы сьпеваў пры Белдзяржмузтэхнікуме.

Выкладаньне ў гэтай клясе будзе весьціся па праграме вышэйшых музычных школ.

Для выкладаньня сьпеваў у гэтай клясе з Масквы прыехаў у Менск вядомы праф. Баначыч.

Такім чынам арганізацыя гэтай клясы будзе першым крокам да рэарганізацыі музтэхнікуму ў беларускую кансэрваторыю.

Беларусізацыя БДУ.

Праўленьне Унівэрсытэту ўстанавіла 2 тэрміны для канчатковага пераходу прафэсуры на беларускую мову. Частка прафэсуры на Падфаку і Праўгасу ўжо вядзе выкладаньне дысцыплін на беларускай мове, асыстэнты і дацэнты—цалкам перайшлі на беларускую мову.

Для астатняй частні ўстаноўлены тэрміны для адной катэгорыі—1929-30 акадэмічны год, а для другой—1930 31 год.

Дэлегаты БССР выяжджаюць на зьезд прафсаюзаў у Маскву.

Сёньня дэлегаты ўсесаюзнага зьезду прафсаюзаў БССР у складзе 24 чалавек выяжджаюць у Маскву.

Работы зьезду працягнуцца каля двух тыдняў.

Удзел БССР ва ўсесаюзным зьезьдзе гісторыкаў-марксыстаў.

27-га сьнежня ў Маскве адчыняецца ўсесаюзны зьезд гісторыкаў-марксыстаў.

Па гэты зьезд ад БССР паедуць праф. Ігнатоўскі, рэктар БДУ праф. Пічэта і дацэнт Пучкоў. Беларускія дэлегаты выступяць на зьезьдзе з навуковымі дакладамі.

Рэалізацыя 11-процантнай пазыкі.

У сучасны момант праводзіцца рэалізацыя новай 11-процантнай дзяржаўнай пазыкі па ўсіх крэдытных установах СССР. Новая пазыка выпушчана на суму ў 300 мілёнаў рублёў і разьлічана на вольныя капіталы з ашчаднасьці, дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый, а таксама і на прыватных асоб, якія пажадаюць зьмясьціць зьберажэньні.

Замах на селькора.

Стрэлам праз вакно паранен загадчык хаты-чытальні в. Озера, Круглянскага раёну, тав. Кавалёў. Устаноўлена, што замах быў зроблен хуліганам Шэвелёвым, які хацеў адамсьціць Кавалёву за заметку ў насьценнай газэце аб хуліганскіх выпадках Шэвелёва.

Злачынец затрыман.

Выдача макарон з крам МЦРК.

Менскі ЦРК з 10 сьнежня пачынае выдачу пайшчыкам макарон па поўнілітраму на кніжку.

Водпуск макарон будзе праводзіцца незалежна ад зробленай выдачы крупы і штодзень будзе выдавацца 10.000 пайшчыкам з адзінкай у заборнай кніжцы.

Дэнатурату хопіць.

Менскі сьпіртаводачны завод заключыў дагавор з Менскім гэрабкопам на продажу дэнатурату ўва ўсіх каапэрацыйных крамах.

Апрача гэтага распачалася прадажа дэнатурату і ў крамах Цэнтрасьпірту.

ДА ВЕДАМА СЕЛЬКОРАЎ ЛАГОЙСКАГА РАЙЁНУ.

16 сьнежня г. г. райком КП(б) супольна з рэдакцыяй „Бел. Вёска" склікае нараду сельскораў Лагойскага раёну. На нараду запрашаюцца т. т., якія супрацоўнічаюць ва ўсіх друкаваных газэтах.

АПА райкому КП(б)Б.

Менскі дзень.

Чарговымі пастаноўкамі БДТ-1 пойдуць п'есы «Над Нёманам», «Крывая аблона» і „Коваль-заваёўнік". Апрача гэтага БДТ-1 рыхтуе да пастаноўкі балетны вечар.

— 40.000 руб. асігноўваюцца на бягучы 1928-29 гаспадарчы год на заканчэньне інстытуту фізычных мэтадаў лячэньня, які будуецца ў Менску.

Бяспрытульныя на—вытворчую працу.

Упаўважаны цэнтр. камісіі дапамогі дзецям па Менскай акрузе гэтымі днямі накіраваў у розныя вытворчыя майстэрні 10 бяспрытульных. Апрача таго, 10 дзяцей бяспрытульных накіраваны ў музычныя каманды вайсковых частак.

Арганізацыя экскурсійна-лектарскага бюро.

Дагэтуль клюбы і прадпрыёмствы не мелі такога органу, куды можна было-б зьвярнуцца з запрашэньнем лектара. А іншым акругкому партыі даваў клюбам і прадпрыёмствам толькі дакладчыкаў па палітычных пытаньнях, а па пытаньнях навукі і тэхнікі прыходзілася зварочацца да асобных лектароў і часта з гэтага нічога ня выходзіла.

У галіне наладжваньня экскурсій таксама ня было дагаворанасьці, калі і ў якіх дні калектывы прадпрыёмстваў і ўстаноў могуць правесьці экскурсію на той ці іншы завод альбо тую ці іншую культурную ўстанову.

Музэі таксама не былі прыстасаваны для абслугоўваньня рабочых. Ня былі вызначаны і іншыя месцы, якія можна было-б скарыстаць для экскурсій.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў гэта пытаньне і пастанавіў арганізаваць пры Культаддзеле ЦСПСБ, як вопыт, лектарска-экскурсійнае бюро для абслугоўваньня клюбаў і прадпрыёмстваў лектарскімі сіламі па спэцыяльных пытаньнях, а таксама і для вучоту і ўрэгуляваньня мясцовых менскіх экскурсіяў. Вырашана ўстанавіць сувязь з шэрагам маскоўскіх і ленінградзкіх вучоных, інжынэраў і прафэсароў.

Культаддзелу дано ўказаньне вучасьць лектарскія сілы г. Менску па ўсіх спэцыяльнасьцях для скарыстаньня ў клюбах. Побач з гэтым Культаддзелу запрапанавана наладзіць сувязь з месцамі экскурсій, каб можна было ўстанавіць прыкладны каляндарны плян экскурсій.

IV усебеларускі зьезд інспэктароў нарасьветы.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла склікаць на 10 студзеня IV усебеларускі зьезд інспэктароў народнай асьветы. У працы зьезду прымуць удзел усе акруговыя і раённыя інспэктары народнай асьветы, а таксама будуць запрошаны прадстаўнікі пэдтэхнікуму БССР. Праца зьезду разьлічана на 5 дзён. Паміж іншымі пытаньнямі зьезд абгаворыць даклад Наркома Асьветы тав. Баліцкага аб чарговых задачах у галіне культурнага будаўніцтва. Апрача таго ў парадку дню зьезду стаяць даклады: 5-хгадовы вытворчы плян у галіне нарасьветы, пастаноўка выхаваўчай і навучальнай справы ва ўстановах сацвыху. формы і мэтады масавай паліт.-асьветнай працы, формы і мэтады інструктажу установу сацвыху і інш.

Ужо утворана арганізацыйная камісія. Дадзены заданьні дакладчыкам.

Абгаварэньне мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці.

У Менскай акрузе зараз праводзіцца па сельсаветах і райёнах абгаварэньне мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці.

У пачатку студзеня 1929 г. Менскі акрвиконкам шырокую нараду з прадстаўнікоў РВК, райённай агранамыі, намітэтаў узаемадапамогі, райённых с.-г. саветаў, калгасаў, савгасаў, дасьледчых станцый і с.-г. каапэрацыі, якая пасьвіна абгаварыць усе пытаньні, зьвязаныя з падвышэньнем ураджайнасьці.

Культурныя навіны

Новае аб забароне ўшанаваньня памяці Тараса Шэўчэнкі.

Цэнтрархіў вывяў цікавыя дакументы, якія датычацца забароны сьвяткаваньня 21-га лютага 1914 г. стагодзьдзя з дня нараджэньня Тараса Шэўчэнкі. Менскі губернатар тыго часу разаслаў сакрэтны абазнік усім адказным чынам паліцыі не дапускаць ні дэманстрацый, ні публічных выступленьняў, зьвязаных з ушанаваньнем памяці украінскага паэты Тараса Шэўчэнкі.

Цікавы помнік з яўрэйска-хрысьціянскіх сэкт.

Беларускі Дзяржаўны музэй набыў вельмі рэдкую манэту-амулет 17-га стагодзьдзя, якіх на тэрыторыі Савецкага Саюзу знайдзена пакуль што некалькі штук. Амулет мае форму мядзянай манэты, на абодвых бакох якой выбіты па-гэбрайску розныя кабалістычныя формулы. Ёсьць меркаваньні, што амулет гэты належыць адной з кабалістычных яўрэйскіх сэкт, якія стаялі блізка да хрысьціянства.

На антырэлігійным фронце.

Рост ячэек саюзу «Бязбожнік».

За апошні час на Менскай акрузе назіраецца рост ячэек саюзу «Бязбожнік». Так, усяго зараз па акрузе налічваецца 42 ячэйкі, якія яднаюць каля 2.500 чал. З гэтай колькасьці на раёнах акругі 24 ячэйкі.

Пры некаторых ячэйках акругі працуюць антырэлігійныя гурткі.

Апрача гэтага, на гораду маецца 12 ініцыятыўных груп, якія праводзяць на прадпрыёмствах працу па арганізацыі новых ячэек саюзу „Бязбожнік".

Зацікаўленасьць настаўніцтва да працы ячэек «Бязбожнік».

Наглядаецца вялікая зацікаўленасьць да антырэлігійнай працы з боку настаўніцтва, у асаблівасьці вясковых школ Менскай акругі. Адночча арганізоўваюць на месцы ячэйкі і гурткі саюзу „Бязбожнік" і кіруюць імі, а таксама дапамагаюць у штодзённай працы вясковым ячэйкам.

Удзел навуковых працаўнікоў у антырэлігійнай працы.

За апошні час некаторыя навуковыя прапаўнікі г. Менску прымаюць актыўны ўдзел у антырэлігійнай працы. Апошнія кіруюць антырэлігійнымі сэкцыямі, якія арганізаваны Менскім акруговым савецкім саюзу «Бязбожнік».

Антырэлігіная праца ў клюбах.

У клюбах Менску ажывілася антырэлігійная праца.

Так, у клюбах будаўнікоў і варсучасьці арганізуюцца куткі „Бязбожнік", бібліятэкі, распаўсюджваюцца антырэлігійная літаратура і выпісваюцца антырэлігійныя газэты і часопісі. У гэтых-жа клюбах ладзяцца гурткавая антырэлігійная праца. Пры польскім клюбе імя Розы Люксэмбург ужо арганізаваны куток бязбожніка, маецца сэкцыяльная бібліятэка, працуюць антырэлігійныя сэмінары і гурток на польскай мове. У чыгуначным клюбе імя Леніна прыступлена да арганізацыі кутка «Бязбожнік».

СУД.

ДАГУЛЯЛІСЯ.

Калі Кастусь Мікітаў Лагун—студэнт 3 курсу мэдфаку, ён-жа артыст вандроўнага тэатру Гатубка і яго задушэўны сябра—кавэтраўэр менскай страхкасы Пётра Ігуменаў праходзілі на Савецкай, ны каля півной стыкаліся і заходзілі выпіць, пасьпадзець, паслухаць музыку.

Вядома, што на выпіўку патрабаваліся грошы, а кішэні як Лагуна, так і Ігуменава былі пустыя.

У Лагуна адразу паўстала думка як дастаць грошы і там-жа ў півной ён прапанаваў Ігуменаву зрабіць некалькі падлогаў—напісаць фіктыўныя ардэры і атрымаць з страхкасы хоць рублёў сто.

Ігуменаў адразу згадзіўся. Раніной Лагун, пад відам беспрацоўнага, зьявіўся ў страхкасу і атрымаў ад інспэктара Ігуменава сфабрыкаваныя ім 8 фіктыўных ардэроў.

Лагун атрымаў грошы на 2 ардэрах і вечарам сябры былі ўжо ў півной.

Фіктыўныя ардэры ішлі ў ход і такім шляхам страхкаса выплаціла Лагуну і Ігуменаву каля 500 руб., але ўрэшце сябрам не пашанавала—касір страхкасы злавіў Лагуна, атрымаў як афэрыста і тут ён выдаў свайго сябра Ігуменава. Абодвы яны апынуліся на лаўцы падсудных.

Справа разглядалася ў Менскім акруговым судзе, які прыгаварыў: Кастуся Лагуна на адзін год зьняволеньня з скарыстаньнем яму пакараньня на аднінстні за 8 месяцаў, а Пётру Ігуменава на шэсьць месяцаў прымусовай працы на спэцыяльнасьці, з абавязковай зьвыш тэрміновай працай і наніжэньнем пэнсіі на два разрады, а таксама і з спагнаньнем з яго на карысьць страхкасы 250 р. 95 к.

Ж.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

За падлог.

Грамадз. вёскі Маталыга, Барысаўскага раёну Сяргей Паўлаўноў, будучы дэсэнтыкам 3 раёну 5 вуч. лесараспрацовак МБВ чыг., з мэтай нажывы выпісаў падложныя квіткі на выдуманыя прозьвішчы і, такім чынам прысвоіў 126 р. з падлочотных сум.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў г. Барысаве, на аснове 1 ч. 113 і 116 арт. КК, прыгаварыла: Сяргея Паўлаўнова на адзін год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

ШАХМАТЫ № 28

Пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

Задача М. Штэйна—Менск. Друкуецца першы раз.



Бел. Кр f4, Cd1, Kh2 пп e3, f5, g2.
Чорн. Кр h4, пп e4, g3, h6.
Мат у 3 хады.

Партыя іграна ў чэмпіянаце РСФСР у лістападзе 1928 г.

Бел. Шабаршын—Ленінград.
Чорн. Касаланаў—Казань.

1 d2-d4, Kg8-f6, 2 c2-c4, e7-e6, 3 Kb1-c3 Cf8-b4, 4 a2-a3 Cb4:c3, 5 b2:c3 b7-b6, 6 f2-f3! 0-0, 7 e2-e4, d7-d6, 8 Cf1-d3, e6-e5, 9 Kg1 e2, Cc8-b7, 10 0-0 Kb8-d7, 11 Ke2-g3, Лf8-e8, 12 Фd1-c2 Kd7-f8, 13 f3-f4 Kf8-d7, 14 Cc1-e3, e5:f4, 15 Лf1:f4 Kf8-g6, 16 Лf4-f2, Kd7-f8, 17 Лa1-f1, Kg6-h8, 18 Фc2-e2, Kf8-g6, 19 Лf2-f5, Cb7-c8, 20 Лf5-h5, f7-f6, 21 Фe2-f3, Cc8-e6, 22 Kg3-f5, Kg6-f8, 23 g2-f4, Ce6-f7, 24 Лh5-h3 Kf8-e6, 25 Лh3 g3, Ke6-g5, 26 Фf3-g2, Фd8-d7, 27 h2-h4, Kg5-e6, 28 Фg2 f3, Фd7-a4, 29 g4-g5, f6:g5, 30 d4-d5, Ke6-c5, 31 Лg3:g5 Cf7-g6, 32 Ce3-d4 Kc5:d3, 33 Фf3:d3 і чорныя праіграні. Партыя цікава на дэбюту.

Шахматна-шашачная праца ў прафсаюзах.

Сыстэматычна праводзіцца праца на саюзу гарбароў: амаль што на ўсіх прадпрыёмствах з'арганізаваны шахматна-шашачныя гурткі. Праводзяцца спаборніцтвы і таварыскія матчы. Прапаў кіруе Кейлюс.

Па саюзу савгандльслужачых у нядзелю, 9 сьнежня, а 7 в пал. гадзіне увечары ў клюбе пачынаюцца лекцыі па тэорыі шахматнай гульні.

Падыходзяць весткі аб інтэнсыўнай арацы ў Віцебску, Гомелі і Барысаве.

Паштовая скрынка.

Н. Б.— Аўтару артыкула „Як можна павялічыць ураджайнасьці нашай гэбы"— рэдакцыя просіць паведаміць ваша прозьвішча і адрас, інакш артыкул ня пойдзе.

Анцыпенка В. Допіс ваш накіраван у Кастрычн. РК КП(б)Б.

Салаўю (Шклоў). «Праца пачалася»—ня пойдзе. Залічым. Дасылайце допісы.

Аўтару допісу „Сводкі і насьлінкі"—накіравана пракурору Менакругі.

Я. С. «Чуткі"—ня пойдуць, няма пікага сэнсу займацца гэтымі справамі. Давайце лепш канкрэтны матар'ял.

Рашалу А. Аб антэны пасланы ў Менакрэдраў.

Спамыўцу «Брыдоты Мсьціслаўскай каапэрацыі»—пасланы Магілёўскі РСІ.

Случайнаму. Аб „чванстве"—ня пойдзе. Калі ёсьць недарочнасьці ў каапэрацыйнай практыцы з боку асобных т. т., дык трэба аб гэтым пісаць канкрэтна, каб можна было зрабіць адпаведныя вынікі.

ПАПРАЎКА.

Ва ўчарашнім № «Сав. Бел.», у нарадзе пошнім радку заметкі «Новыя акадэмікі Усес. Акад. Навук» надрукавана—«па геофізычных»—а трэба па—біялёгічных.

Апавяшчэньні.

У суботу 8-XII г.г. а 7гадзіне вечары ў апагабінэце абдукцыяна кансультацыя тав. Хрупкага для рабочых прапагандыстых-кіраўнікоў АПШ і ўсіх кіраўнікоў АПШ (некамвузаўцаў).

Яўка ўсіх абавязкова.

У НАВУКОВЫМ ТАВАРЫСТВЕ.

У нядзелю, 9-XII, а 5 гадз. увеч., у фіз. ауд. БДУ адбудзецца сход. ФІЗ.-МАТЭМАТ. СЭКЦЫІ.

На павестцы даклады:

1) дац. А. УСЬПЕНСКІ—„Эфэкт Рамана".

2) дац. УЛ. ДЫДЫРКА—„Новыя спосабы абудаваньня цыркуляўных крывых".

3) дац. А. КРУТАЛЕВІЧ—«Матэдычныя дробазі».

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня а 8 в палов. увеч. заняткі музычнага гуртка.

— Нядзеля а 7 гадз. увеч. пасяджэньне фракцыі праўленьня дому.

У нядзелю 9-га сьнежня г.г. а 8-й гадз. увечары адбудзецца вечар 10-цігодзьдзя жанадзелаў.

Уваход для членаў ячэйкі КП(б)Б па партбілетах, а для членаў саюзу па рэдзных білетах.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Субота, 8 сьнежня
САЮЗУ БУДАЎНІКОЎ.
„Мешчанін дваранінам".
Пачатак роўна а 8 гадз. увечары.
Пасьля 3-га сыгналу ўваход у відоўню зачынен.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Нямецкі баявік „МАРАЛЬ" у 6-ці частках „МОСТ ПРАЗ ВЫПЬ" у 6-ці частках. Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 45 хв.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ